РУТА-МЯТА

Ты —
мой трывожны ўспамін,
Шчыміш і не даеш спакою,
Нібыта ўдар тугіх галін,
Адпушчаных чужой рукою.

Рыгор Барадулін

Ніхто не бачыў, як яна не па гадах борздзенька ўзбегла на высокі ганак, нетаропка прайшла па вузкаму рэдакцыйнаму калідору і спынілася перад апошнімі па левую руку дзвярамі. Молада кінула позірк на пажоўклую шыльдачку — "Рэдактар", паправіла пышную прычоску — мініяцюрны кошык, сплецены з залацістых валасоў над высокім ілбом, і ціха пастукала — пэўна, пазногцем ці адным з масіўных пярсцёнкаў на правай руцэ, бо стук атрымаўся гулкі, як па днішчы парожняй бочкі.

— Заходзьце! — пачулася з кабінета.

Акруглыя плечы жанчыны ледзь прыкметна сцепануліся — знячэўку, на нейкае імгненне; маленькая, як у падлетка, рука прыдзірліва разгладзіла на грудзях і бёдрах дарагі, у зіхатлівых бліскаўках бледна-ружовы касцюм і толькі тады адчыніла цяжкія аднастворкавыя дзверы.

— Праходзьце, калі ласка, ся-да... — бадзёры мужчынскі голас нечакана абарваўся на паўслове, а калі ён пачуўся зноў, то быў ужо і сцішаны, і разгублены адначасова. — Галя?.. Якім ветрам?..

— Лёша! — яна гулліва працягнула яму насустрач адразу абедзве рукі, але ён не спяшаўся ні паднімацца з крэсла, ні выходзіць з-за стала.

Даўным-даўно забытая крыўда зноў варухнулася пад самым сэрцам.І зноў, як тады, калі цвіла рута-мята, стала цяжка дыхаць. Ён без патрэбы папраўляў акуляры, нязвязна паўтараючы:

— Галя... Вачам сваім не веру... Няўжо ты?..
Так, гэта была яна.

Усе называлі яе нязвыклым для тутэйшых мясцін імем — Галка, і толькі адзін ён, Аляксей, зваў яе па-простаму, без усялякіх выбрыкаў, Галя, — зрэдзь калі — Галіна. Яна не крыўдавала. Наадварот, ёй было прыемна перакінуцца некалькімі словамі з гэтым стройным, толькі што дэмабілізаваным сяржантам.

Яны пазнаёміліся ў той самы вечар, калі Аляксей пасля доўгай і тлумнай дарогі з аўстрыйскага Карнайбурга апынуўся ў Мілавічах, ціхім палескім гарадку, у даўжэзнай, падобнай на барак, хаціне, скіданай са сточанага бярвення-верхавінак. Хаціна была на дзве палавіны: у большай жылі родзічы Аляксея — сястра з мужам і дзецьмі, меншую займала адзінокая, на рэдкасць дабрадушная бабулька Эльжбета Казіміраўна — бабка Эля, як яе называлі суседзі.

Даўно заўважана: дабрыня прыцягвае да сябе ўсё жывое, як магніт — жалеза. Асабліва падатлівыя на яе дзявочыя сэрцы. У дзяўчат яно ўсё атрымліваецца і прасцей, і прыгажэй. Людскую дабрыню яны ці то пазнаюць, ці то адчуваюць у любых абставінах, нават на адлегласці, і прывязваюцца да яе рашуча, часам да самазабыцця.

Пакойчык, у якім жыла Эльжбета Казіміраўна, быў перагароджаны на ўсю шырыню паркалёвай фіранкай — трошкі вышэй чым у рост чалавека. Ад парога, адразу за грубкай, стаяў бабульчын старамодны драўляны ложак; у кутку мясціўся не надта каб вялікі, але зручны стол, таксама даўняй работы; паўз сцяну, упрытык да двух шырокіх падаконнікаў, пабліскваала жаўцізной вышараваная высокая лаўка. Фіранка хавала ад старонняга вока два нікеліраваныя ложкі на колцах — шырокія, першага пасляваеннага вырабу; між імі горбілася этажэрка з кнігамі і расколатым напалам люстэркам на верхняй палічцы, а наўзбоч, каля двух невялікіх акенцаў, стаялі чатыры лёгенькія, вельмі зграбныя табурэткі. Тут у Эльжбеты Казіміраўны жылі кватаранты. Хлопцаў бабулька ніколі не брала, і на кватэры ў яе стаялі адны дзяўчаты — работніцы мясцовай арцелі "Сцяг

працы". Прамкамбінат тады яшчэ толькі будаваўся, і арцель лічылася адзіным прамысловым прадпрыемствам на ўвесь раённы гарадок.

Эльжбета Казіміраўна, як толькі дазналася, што ў іхнім доме аб'явіўся госць, адразу ж падалася да суседзяў, каб высветліць усё, як след. Аляксей ёй спадабаўся, і яна пачціва запрасіла яго на сваю палавіну.

— З дзяўчатамі пазнаёмлю, кватаранткамі маімі, — ласкава паабяцала яна. — Слаўныя яны ў мяне, паслухмяныя. Ці то Галка, ці Надзя. Усе слаўныя — і Зіна, і Каця.

Дзяўчатам жа яна падсыпала жару.

— Ой, дзеванькі, каб вы толькі паглядзелі, — пляскала старая ў далоні. — І высокі, і сур'ёзны. Сам бландзіністы такі. І гаворыць дужа хораша: усё па-руску, па-руску. Адвык, мусіць, па-нашаму: больш за пяць гадоў служыў за мяжой,у нейкай там Аўстраліі, ці што...

— Можа, у Аўстрыі? — паправілі яе дзяўчаты.

— Самі спытаеце, — адмахнулася Эльжбета Казіміраўна. — Абяцаў сёння зайсці да нас...

Няцяжка зразумець, з якой цікавасцю чакалі яго прыходу. Дзіва што: не на пабыўку прыехаў — назусім. Халасцяк да таго ж, сям'ёй чалавеку абзаводзіцца трэба. А якая з дзяўчат не марыць, каб удачліва звіць сваё гняздо? У тыя першыя пасляваенныя гады, калі многія не па сваёй віне засядзеліся ў дзеўках, гэта лічылася, мякка кажучы, асабліва важным.

На покліч Эльжбеты Казіміраўны — "Дзе вы тамака падзяваліся?" — першай з-за фіранкі паважна выйшла смуглявая, як цыганка, кірпаносая дзяўчына ў паношаных тапачках-балетках. Яна ўважлівым позіркам змерала вайскоўца з галавы да ног, прыветна ўсміхнулася і падала руку:

— Здрасце! Мяне Надзяй завуць.

— Добры вечар, — Аляксей пацісну руку, але сказаць больш нічога не паспеў, бо за Надзінай спіной ужо стаялі яшчэ тры дзяўчыны.

Надзя была сярод іх самай баявой, таму і верхаводзіла як хацела. І ўсё атрымлівалася ў яе натуральна і занадта вольна, не горш, чым у разбітнога тамады пры гаманкім застоллі.

— Табурэткі, дзяўчаты, падавайце, — мітусілася яна. — Знаёмцеся, Алёша: гэта — Зіна, гэта — Каця...

Тоненькія, як вясенні парастак вербалозу, Зіна і Каця па чарзе падалі свае не па камплекцыі вялікія і — адчувалася — моцныя,рабочыя рукі, сарамліва ўсміхнуліся і адышлі ўбок.

— А гэта — наша Галка.

— У вас прыгожае імя, Галя, — сказаў Аляксей, затрымліваючы ў сваёй руцэ доўгія і чамусьці халодныя пальцы дзяўчыны. — Галя... Галіна... Галінка.

І зусім нечакана для сябе ён раптам прадэкламаваў першыя радкі верша, які вельмі любіў.

— Галінка-вярбінка, —
Прасіў верабей, —
Мо' пакалыхала б
Маіх ты дзяцей?
Галінка не хоча
Дзяцей калыхаць.
— Ідзіце, казулі,
Галінку ламаць!

— О-о! —высока ўзняла тонкія падкоўкі-бровы Галіна, і Аляксей заўважыў, што вочы ў яе — сінеча нябесная, глыбокая і спакойная. — Вы —паэт?

— Які там паэт, — махнуў ён рукой. — Самы звычайны салдат. Праўда, цяпер ужо дэмабілізаваны.

— Цур! Не маніце, — умяшалася Надзя, разглядаючы нашыўкі на пагонах. — Лепей сядайце і расказвайце, таварыш сяржант, дзе былі, што бачылі, як там людзі жывуць?

У той вечар Аляксей засядзеўся ў дзяўчат мала што не да паўночы. Слухалі яго ўважліва, і гэта падабалася яму. Расказ пра далёкую Вену, пра звычаі тамтэйшых людзей, іх непрыкрыты, нават некалькі смешны інтарэс да жыхароў з Белай Русі, пра якую яны дазналіся адно пасля вайны — ад нашых салдат, атрымаўся, пэўна, цікавым. Аляксей лавіў на сабе дзявочыя позіркі і думаў: "Праўду кажуць: дзяўчаты слухаюць вачамі". Нават Эльжбета Казіміраўна слухала ціха, здавалася, не дыхаючы, пакуль над сталом на доўгім дроце паволі не заморгала лямпачка-дваццаціпятка, што азначала: хутка поўнач, праз колькі хвілін выключаць святло.

— Я праводжу вас, Алёша, — першай усхапілася з табурэткі Надзя, накінула на плечы хустку-муль-

танку і рушыла за парог, прыгаворваючы. — Добрага госця праводзяць не толькі за парог, але і да веснічак.

"Навошта мяне праводзіць? — падумаў Аляксей. — Уваход да сястры таксама з двара, ганачкі амаль што побач". Але пярэчыць ён не стаў: парыпваючы хромавымі ботамі, моўчкі пайшоў услед за дзяўчынай.

Калі Надзя ў хуткім часе вярнулася, Зіна і Каця кінуліся да яе:

— Ну?..

— Ці пацалаваў?

Надзя разгублена прыкусіла ніжнюю губу:

— Стаяў, як статуя. Нават рукі не падаў.

Ніхто з іх — ні дзяўчаты, ні Эльжбета Казіміраўна — не заўважылі тады, з якой палёгкай уздыхнула Галіна і тут жа шмыганула за фіранку.

На наступны дзень Аляксей і Галіна сустрэліся зноў. Выпадкова. Каля ваенкамата.

Дзень быў пахмурны, халодны. Уранку яшчэ імжэў-накрапваў дождж, а цяпер, папоўдні, ён неўзаметку аціх, на вуліцы стала зябка і няўтульна. Ваенкамат размяшчаўся ў невялікай цаглянай каробцы, якую наспех яшчэ ў вайну давялі да ладу: зрабілі вокны, навесілі дзверы, накрылі саломай-праміцай, і цяпер азяблыя вераб'і з трывожным ціўканнем шыліся ў нізкі застрэшак гэтай адзінай на колішнім квартале будыніны.

Аляксей выйшаў з ваенкамата, прычыніў на кручок веснічкі, краем вока зірнуў на свае пагоны. Потым адшпіліў іх і схаваў у кішэню.

— Адслужылі, дарагія мае, — сказаў ён ледзь чутна і, уздыхнуўшы на ўсе грудзі, спытаў самога сябе: — Што ж будзем рабіць далей, таварыш сяржант запасу першай катэгорыі?

Хацелася закурыць, і ён доўга мацаў па кішэнях, шукаючы запалкі. Нарэшце знайшоў, закурыў — соладка зацягнуўся ходкай па тым часе "кацюшай". Па вуліцы, абганяючы яго, кудысьці спяшаліся гараджане. Кінулася ў вочы, што ўсе яны задужа сціпла апранутыя: у ватоўках, салдацкіх шынялях, матроскіх бушлатах, кірзавых ботах, а то і проста ў гумавых бахілах з аўтамабільных камер. Нікога з гэтых людзей Аляксей не ведаў і таму здзівіўся, калі ней-

кі дзядок у шапцы-вушанцы казырнуў яму і гучна павітаўся: "Здравія жалаю!" Аляксей было ўзняў руку, каб казырнуць у адказ, але ўспомніў, што ён без пагонаў, паправіў казырок сваёй шапкі з зорачкай і адказаў так, як звычайна здароўкаюцца тут людзі шаноўнага ўзросту: "Дзень добры вам".

Галіну, хоць і бачыў яе толькі раз, ён пазнаў зводдаль. Стройная, як таполя, яна ішла насустрач, ішла нетаропка, як гэта робяць людзі, якім або няма куды спяшацца, або няма чаго рабіць. Белы пуховы берэцік быў трошкі ссунуты набок, а з-пад яго па чорнай плюшавай жакетцы густа рассыпаліся хвалістыя русыя валасы. На нагах у яе былі блішчастыя гумавыя боцікі з кароценькімі халяўкамі — бадай што самы модны абутак у першыя пасляваенныя гады.

— Гэта вы?! — збянтэжылася ад нечаканасці Галіна, спынілася і нясмела падала руку. — Добры дзень. Дайжа не думала, што стрэну вас. Ледзь пазнала — ніколі не бачыла ў шынялі. А вам да твару вайсковая форма. Вы ў ёй такі сур'ёзны і...

Аляксей аберуч трымаў халодную далонь дзяўчыны. Ён чакаў, што яна скажа далей. Аднак Галя замоўкла, апусціла вочы долу.

— Што — і? — спытаў ён.

— Нічога, — шапнула яна. — Адпусціце маю руку.

Нейкі час яны стаялі моўчкі. Міма праходзілі людзі, азіраліся, а яны глядзелі адзін на аднаго і маўчалі.

— На работу? — парушыў маўчанне Аляксей.

— Не, з работы. У мяне сёння першая змена.

— Тады нам па дарозе.

— А вы спяшаецеся, Аляксей Фаміч? — Галіна ўзняла на яго свае сінія-сінія вочы. І ён мала што не жахнуўся ад раптоўных змен у яе позірку: вось толькі што ён быў востры, як іголка, а зараз такі спакойны і лагодны, як зацішны плёс дзе-небудзь на ўзлеску.

— Пакуль што мне няма куды спяшацца...

Вочы справядліва называюць вокнамі душы. У іх часам можна ўгледзець куды больш, чым удаецца выказаць словамі. Трэба толькі быць уважлівым, умець бачыць добрае ў гэтых "вокнах" і не назаляць празмернай цікаўнасцю, не падглядваць у іх.

— Можа, праводзіце мяне да сястры? — У яе вачах няўлоўна мільгалі агеньчыкі ўпэўненасці: "Праводзіш, нікуды не дзенешся". Але вось агеньчыкі ўраз патухлі, і на змену ім засвяцілася нешта большае, чым жаданне: "Прашу цябе, згаджайся". — Я вам наш гарадок пакажу, раскажу пра яго, што знаю.

Яны збочылі ў невялікі, ацалелы ў вайну завулак з неверагодна вузкай праезджай часткай, прайшлі колькі крокаў па такому ж вузкаму, як размінуцца, дашчанаму тратуару і выйшлі на прамую вуліцу, не надта каб шырокую, але забрукаваную і даволі чыста прыбраную. Дамы скрозь стаялі дабротныя, найчасцей васьмісценкі, зрубленыя ў нямецкі вугал, да таго ж усе пад чарапічнымі ці бляшанымі дахамі — як напаказ.

Галіна аказалася няблага дасведчаным чалавекам, і пра ўсё, што траплялася па дарозе, расказвала з упэўненасцю і хваткай самдзелішняга экскурсавода. Прасторны дом з высокім ганкам на вуліцу, аказваецца, за польскім часам належаў скупечы-аптэкару, якога яшчэ задоўга да вайны сквапнасць звяла са свету; ці то сам атруціўся ў склепавай каморы, дзе звычайна палавініў дозы мікстур і прымочак, падсыпаў у нейкія дарагія парашкі мел, ці то зяць наўмысна атруціў, каб загрэбсці багацце ў свае рукі... Дзве старыя абгарэлыя бярозкі пасярод пустэльнага пляца, — гэта ўсё, што засталося ад равесніка горада — базарнага пятачка. Бярозкі выжылі, не ўсохлі; пад імі і цяпер двойчы на тыдні, у чацвер і нядзелю, яшчэ нацямочку сходзяцца ці з'язджаюцца людзі са сваімі адвечнымі спадарожніцамі — патрэбай і надзеяй... На рагу вуліцы, непадалёк ад руін сінагогі, стаіць вясёлы (ажно на дзевяць вокнаў) абшаляваны дамок. Гэта — вотчына дзядзькі Кувеля, самага знакамітага на ўсю акругу каваля. Арон Кувель пакуль што адзіны з тутэйшых старажылаў, хто вярнуўся на бацькава котлішча. У першыя дні вайны многія яго суседзі, асабліва маладыя мужчыны (а разам з імі і каваль), махнулі рукой на свой набытак і, можна сказаць, на вачах у нямецкіх парашутыстаў, асядлаўшых усе дарогі ў Мілавічы, спрабавалі выбрацца з горада, каб падацца на ўсход. Перахапілі іх фашысты недзе па дарозе на Чырвоную Слабаду, закатавалі ў лесе. Усіх ці не ўсіх — ніхто не ведаў.

Сем'і іхнія былі кінуты ў гета і загінулі. А вось Кувель, як ён сам гаварыў, "ацалеў, вярнуўся". Пра лёс астатніх каваль нічога толкам не ведаў, таму ніколі не расказваў, апроч аднаго: "З Яшкам-малатабойцам мы ўдвух прарваліса, згубіўса ён за Волгай". Спачатку, пакуль рамантаваў свой паўразбураны дом, Кувель жыў у кузні адзін, як палец. Потым набраў кватарантаў і мала-памалу зноў пачаў займацца сваім рамяством. Кавальства і цяпер на вёсцы (ды і ў горадзе) цэніцца асабліва высока, а ў тыя пасляваенныя гады яму ўвогуле цаны не было. Рэдка якая сям'я абыходзілася без кузні. Умеў жа Кувель рабіць усё: ад клямкі ў дзвярах і юшкі ў коміне да зграбных статуэтак, ваз, падсвечнікаў і мініяцюрных імянных табакерак. Ад удзячных заказчыкаў у яго адбою не было. І ўсё ж нехта з гараджан быў "пусціў вутку", быццам Кувель па начах з малатком і зубілам лазіць па руінах, усё нешта шукае. "Ці не золата?.." "Адкуль таму золату быць, адны печышчы асталіся". Пагалосцы ніхто не паверыў, і пра яе ўсе хутка забыліся.

— Адкуль вы ўсё гэта ведаеце? — не хаваў свайго здзіўлення Аляксей.

— Мы жылі тута непадалёк, пад Пінскам. Я з бацькам перад самай вайной прыязджала сюды на базар, гуркі прадавалі... Бачыце вось гэтыя абгарэлыя шулы? Тут была конавязь. А трошкі далей, ву-у-нь пад тым перканам, стаяў даўжэзны стол з негабляваных дошак. На ім і выстаўлялася ўсё, што прывозілася на продаж ці абмен...

Амаль што побач з базарным пятачком, пад купкай стромкіх сасонак, стаялі дзве некалькі дзіўныя хаціны. Дзіўныя ў тым сэнсе, што непадобныя на ўсе астатнія. Былі яны яшчэ свежага, як бы сказаў кравец, крою — не паспелі пашарэць, высокія, вянцоў на васемнаццаць і такія востраверхія, што цяжка было ўявіць, як тыя цесляры трымаліся на латах, каб злаўчыцца гэтак прыгожа — веерам — прыбіць гонту.

— "Кірхі!" — іранічна сказала Галіна, калі яны падышлі бліжэй.

У адной з гэтых хацін (належала яна адстаўному маёру, што залетась прыехаў з Германіі) Ядвіга, стрыечная сястра Галіны, па сходнай цане здымала

невялікі пакойчык. Год таму назад Ядвіга нечакана аўдавела: разбіўся муж на матацыкле. Цяпер яна з трохгадовым сынам пераехала з вёскі Мілавічы, спадзяючыся яшчэ раз ніштавата ўладкаваць сваё жыццё.

Ядвіга заўважыла Галіну і Аляксея цераз акно, выскачыла з хаты. Павіталася з абоімі за руку і акінула Аляксея не столькі прыветным, колькі гордым позіркам. "Такая доўга ўдавець не будзе", — чамусьці падумалася Аляксею. Ён быў уражаны вельмі ж кідкім падабенствам стрыечных сясцёр. Былі яны аднаго росту, абедзьве бялявыя і сінявокія; нават усмешкі ў іх былі падобныя — белазубыя, сакавітыя.

— Гэта брат Ганны Фамінічны, — тлумачыла Галіна, цалуючы сястру. — Толькі ўчора дэмабілізаваўся.

— Заходзьце, калі ласка, — пачціва запрашала Ядвіга. — Гасцямі будзеце. А госць на парог — радасць у хату.

Аляксей сумеўся.

— Можа, лепей як-небудзь другім разам, — спрабаваў адмовіцца. — Разумееце, сястра чакае. Абяцаў ёй, што адразу ж з ваенкамата — дадому.

— Ну, як сабе хочаце, — не стала ўпрошваць Ядвіга. — А ці будзе ён, другі раз?

Галіна злавіла на сабе пільны позірк сястры, мігам зачырванелася.

— Будзем спадзявацца, — усміхнуўся Аляксей.

І раптам Галіна спыніла яго:

— Алёша! Алёша... сёння — субота, увечары да нас прыйдуць хлопцы. Гармонік прынясуць. Прыходзьце і вы. Дзяўчаты нашы, бабка Эля таксама рады будуць.

І зноў яе вочы. Толькі што яны былі абыякавыя — "прыходзь, калі хочаш, а не хочаш — як хочаш", і раптам усё перайначылася, быццам лёгкі ветрык гайдануў блакітную роўнядзь двух азерцаў, і яна пад тонкім выгібам броваў ласкава заіскрылася прыветлівай цеплынёй — "прашу цябе: прыходзь..."

— Добра, прыйду.

Аляксей ужо не чуў, калі Ядвіга, пазіраючы яму ўслед, з цвёрдай рашучасцю ў голасе гаварыла:

— Галка, бяры яго ў рукі. Аберуч трымай. І нікому не аддавай.

Сёстры згодна пераглянуліся.

Здаўна вядома: гурт весяліць людзей. А калі тыя людзі маладыя, калі ўсё ідзе па-людску, весялосці ў гурце хоць адбаўляй. Праўда, многае залежыць ад завадатара. Калі ён чалавек кемны, сам сабе наўме, тады і пасмяешся дасхочу, і адпачнеш усмак. І наадварот: калі ролю завадатара бярэ на сябе які-небудзь няўмека, што налаўчыўся адно мянташыць языком, не будзе там ні ладу, ні згоды.

Аляксей ужо ведаў (сястра расказала), што за хлопцы збіраюцца ў Казіміраўны па суботах. Цяпер ён сам уважліва разглядваў кожнага з іх, знаёміўся, што называецца, з вока на вока. Сустрэлі яго прыязна, нават з падкрэсленай пачцівасцю. Моцна ціснулі руку, віншавалі з выхадам на "гражданку". Надзя, як і ў яго першы прыход, вынесла з-за фіранкі знаёмы табурэцік, сама ўселася насупраць на лаўцы, дзе побач з Казіміраўнай умясціліся яшчэ чацвёра хлопцаў. Галя, Зіна і Каця стаялі за грубкай, па-жаночы згарнуўшы на грудзях рукі.

Пакуль Казіміраўна нетаропка вяла свой сказ пра тое, "як было даўней, як тады людзі любіліся і жаніліся", Аляксей неўзаметку вывучаў сваіх новых знаёмых. Вылучаўся сярод іх Сашка Гаргун, пляменнік дырэктара мясцовага леспрамгаса. Бацькоў у Сашкі не было — памерлі яшчэ да вайны, і ўсе клопаты аб ім добраахвотна ўзяў на свае плечы дзядзька. Ён не аддаў пляменніка ў дзетдом і не пакідаў яго без сваёй увагі-апекі ні раней, ні цяпер, любіў, мусіць, не менш, чым родных дзяцей. У час блакады (гэта ведалі ўсе ў раёне) ён, праслаўлены партызанскі камандзір, амаль дваццаць кіламетраў нёс па балоце хворага Сашку на сабе, выратаваў хлопчыка ад вернай гібелі. Сашка вырас статным, прыгожым хлопцам. Аднак у армію яго не прызвалі з-за пляскатай ступні. Вучыцца ён чамусьці не схацеў — кінуў школу пасля сямі класаў. З работай у яго таксама нешта не клеілася — нідзе доўга не затрымліваўся. Быў ён модна апрануты — увесь на засцёжках, нават чаравікі. Маленечкая засцёжка-маланка нагрудной кішэнькі была напалову адшпілена, і з яе высока тырчэла бліскучая ручка-самапіска.

Валасы ў Сашкі былі чорныя, як смоль, і спераду прыгожа кучаравіліся. Былі яны такія ад прыроды, ці, можа, Сашка падкручваў іх на гарачых ножанках — гэтага ніхто не ведаў.

Астатнія хлопцы былі звычайныя. Віцька Захарчэня, худы і тонкі, як аглобля, працаваў аператарам у раённым вузле сувязі; Сярожа Клімашэўскі, каранасты, з румянцам на ўсю шчаку, рабіў у лясгасе "старшым куды пашлюць"; Барыс Кірэйка, стройны і даволі сімпатычны чалавек, але ўжо не юнага веку, служыў, як ён сам казаў, "на сталёвых магістралях дзяржавы самым адказным паставым-стрэлачнікам". Пра Барыса варта дадаць яшчэ, што ў яго біяграфіі была адна "нязмыўная пляма": нядаўна ён развёўся з жонкай ("балазе, хоць дзяцей няма" — сказала на гэта Казіміраўна), і цяпер дзяўчаты цураліся яго, як пракажонага. І нішто не выручала "самага адказнага паставога": ні гармонік "хромка", з якім ён нідзе не разлучаўся, ні прыемны голас і майстэрскае выкананне любых, якіх пажадаеце, песень — нішто не бралася ў залік, цураліся яго дзяўчаты, тыкалі пальцам — "распушчэнец", што азначала разведзены з жонкай. Ганьба, што ні гавары.

— Даўней яно як было, — ужо каторы раз менавіта з гэтых слоў пачынала бабка Эля згадваць сваю далёкую маладосць. —Стаіш, бывала, з хлопцам дзе-кольвечы на загуменні, зашыешся ў куток, каб людзі, крый божа, не ўгледзелі. Зуб на зуб не трапляе. А ты стаіш. Прыемна, як ён табе зубы загаворвае, рассыпаецца дробным макам. Адна вось так хавалася ад людзей, хавалася і захварэла. Праз колькі часу памерла ад прастуды...

— Ну й дурная! — рашуча перабівае Казіміраўну Сашка. — Чаго там хавацца. Калі любіш, дык рэж абдымаху на людзях, дзе папала. Праўда ці не?

Ніхто не падтрымлівае Сашку. А ён адступаць не прывык, ідзе напралом — нахрапам. Калі выйсця няма, ён усё роўна будзе шукаць яго. Вось і на гэты раз. Угледзеў, што ўсе маўчаць, тут жа пераарыентаваўся.

— Ты, Казіміраўна, нам тожа зубы не загаворвай, — паблажліва гаворыць ён. — Дала б хоць на кус капусткі. Трэба ж памагчы чалавеку замачыць

"гражданку". Вабшчэ-та з яго прычытаецца, але не будзем дробязнымі. Зверне апасля з працэнтамі.

На стале вокамгненна з'яўляюцца на поўны рост дзве вялікія (пэўна, літровыя) пляшкі з мутнай вадкасцю, гранёныя шклянкі і маленькія келіхі, міска з капустай і акраец хлеба.

— Агонь! — хваліць Сашка самагонку і налівае хлопцам па поўнай шклянцы, дзяўчатам — "па тры кроплі", толькі захінае дно.

— Мне адно ўкапні,Сашка, — просіць Казіміраўна і сама падстаўляе свой келіх. — Адно ўкапні.

За "гражданку" ўсе выпілі адным махам, і толькі тады прыкмецілі, што сам віноўнік нават не прыгубіў.

— А ты што — не п'еш? — смачна хрумстаючы капустай, пытаецца Сашка ў Аляксея. — Хворы ці яшчэ што?

— Не, не хворы. Проста не п'ю. У арміі гэтаму не вучаць.

— Скажы, а на "губе" ты сядзеў? — хітра жмурыць вока Сашка.

— Не сядзеў.

— Які ж ты тады салдат, калі на гаўптвахце не сядзеў? Салдат павінен усяго паспытаць. І, галоўнае, павінен не забываць тры запаведзі: ад сну яшчэ ніхто не памёр; салдат спіць, а служба ідзе; і апошняя — трымайся далей ад начальства, бліжэй да кухні.

Не стрывала Надзя, ускочыла з табурэта, выгукнула рэзка, з выклікам:

— Адкуль табе знаць, Сашка? Ты ж ніводнага дня не служыў у арміі!

— Не служыў, а знаю, — зноў не адступае Сашка і зноў... шукае выйсце. — Што ты — заснуў, ці што, "самы адказны паставы"?

Барыс Кірэйка мігам выцягнуў з-пад лаўкі "хромку", дзе яна, аказваецца, стаяла, прабег пальцамі па галасах зверху ўніз. Гармонік меў жахлівы выгляд: планкі абдзёртыя, мяхі заклеены дзе пластырам, дзе ізаляцыйнай лентай, на галасах не хапала гузікаў. Ажно не верылася, што такі зацяганы, дапатопны інструмент здатны выпускаць чароўныя гукі. Іграў Барыс адменна.Лёгка і занадта вольна. А калі ён, у дадатак да ўсяго, прыгожа хітнуў галавой і заспяваў, Аляксей зразумеў, што перад ім не проста музыка,

а вельмі здольны, нават таленавіты чалавек. Песню, якую спяваў Кірэйка, Аляксей чуў упершыню. Матыў яе нечым нагадваў старадаўнія рамансы аб разбітым каханні. Голас Барыса лёгка ўздрыгваў, адчувалася, што спявае ён ад усёй душы.

Губы твае, як макі,
Рдзеюць-цвітуць пяшчотай.
Лекаў няма ніякіх
Ад душэўнай самоты.

Пасля кожнага куплета песні выконваўся прыпеў. Ён паўтараўся двойчы і як бы звязваў тэкст у адно цэлае.

Свет абыду, як трэба,
Дол абшукаю й неба.
Толькі знайду я — веру! —
Зорку маю Венеру.

Песня падабалася Аляксею. Асабліва матыў, выкананне. Была яна, відаць, з песень таго разраду, што беззваротна палоняць дзявочыя душы. Жаночая палавіна, можна было здагадацца, ужо не раз чула яе, тым не менш слухала, затаіўшы дыханне. Віцька Захарчэня і Сярожа Клімашэўскі таксама не спускалі вачэй з Барыса, употай, пэўна, зайздросцілі яго майстэрству. Толькі Сашка нешта надзьмуўся, як індык, рабіў выгляд, што ні словы песні, ні яе мелодыя не кранаюць яго.

Золак над полем веснім
Будзіць вясёлы вырай.
Стрэну цябе я песняй,
Светлай, як дзень, і шчырай.

Нарэшце Сашка не стрымаўся, злосна кінуў Барысу:

— Годзе! Расплакаўся, як бабёр. Зайграў бы штонебудзь для ног. На душы і так кошкі шкрабуць.

Барыс паслухаўся: зайграў падыспань.

Аляксей не ўмеў танцаваць, але ведаў, што падыспань — самы лёгкі танец. Некалі, у дзяцінстве, ён з чарадой такой жа, як і сам, басаногай дзятвы цікаваў з-за плоту, калі ля Бахоўкінай хаты пускаліся ў скокі вясковыя хлопцы і дзяўчаты. Так атрымалася ў жыцці, што гэтая, як сцвярджаюць, нескладаная навука абмінула яго. Да вайны ён проста не дарос да яе, а ў вайну хіба да танцаў было. Зноў жа ў арміі неяк не выпадала вучыцца танцам. Гар-

нізон доўга стаяў у цэнтры горада і нікога, апроч асабовага саставу, туды не пускалі: ведама ж — заграніца. Цяпер Аляксей шкадаваў, што не паслухаўся аднапалчан і не навучыўся круціцца хаця б у адзін бок... А яго новыя знаёмыя танцавалі па-заліхвацку. Асабліва Сашка. Нават гэты прасцейшы танец ён умудраўся "выдаваць" прыгожа. Плаўна і мякка рабіў два крокі наперад-назад у адзін бок, потым у другі, а калі Галя круцілася па іх узнятымі рукамі, ён дакладна ў такт музыцы дробненька выбіваў-выкаблучваў абедзьвюма нагамі. Нішто сабе танцавалі і Віктар, і Сярожа, а пра дзяўчат і гаварыць не прыходзіцца. Толькі Каця, якую ніхто не запрасіў на танец, разы са два з дакорам зірнула на Аляксея, пайшла за фіранку.

— Стоп!.. Польку! — скамандаваў Сашка і плюхнуўся побач з Аляксеем на лаўку. —Давай ты. Я адпачну. Нешта ногі сягоння цяжкія, як гіры.

— Я не ўмею, — сказаў Аляксей так, што ўсе пачулі.

Барыс перастаў іграць.

— Што? Зусім не ўмееш? — не паверыў Сашка.

— Зусім. Я ў гэтым... як табе сказаць... трактар.

— Няўжо? Што азначае — трактар?

— Што азначае? Верш такі ў Твардоўскага ёсць. Калі хочаце,пачытаю.

— Валяй, разрашаю.

Сашкава "разрашаю" не спадабалася Аляксею, але адступаць не было куды.

Он рядом сидит,
он беседует с нею,
Свисает гармонь
на широком ремне.
А я на гармони
играть не умею —
Завидно, обидно,
невесело мне.
Он с нею танцует —
особенно как-то:
Рука на весу
и глаза в полусне.
А я в этом деле,
действительно, трактор, —
Тут даже и пробовать
нечего мне.

Надзя паспяшалася: Аляксей яшчэ не скончыў чытаць верш, а яна кінулася на выручку.

— Такой бяды! — сумысле выгукнула сваім пісклявым галаском. — Навучыцца танцаваць — што кубак летняй кавы выпіць.

Дзяўчаты падтрымалі яе. Аднак настрой у Аляксея быў ужо сапсаваны, і ён палічыў патрэбным развітацца. Як толькі падняўся з лаўкі, Галя, апярэджваючы Надзю, прапанавала:

— Я праводжу вас, Алёша... Я запрашала, я і праводжу, — сказала ціха, у бок Надзі, калі тая пакрыўджана насупіла бровы. — Як наша Надзя кажа: жаданага госця трэба праводзіць не толькі за парог, але і за веснічкі...

На дварэ было зорна, холадна. На добры лад Галіне варта было б нечым ахінуць плечы, а яна выскачыла ў адной паркалёвай кофтачцы. Адразу ж сцялася, быццам вылезла з вады на вецер.

— На золку будзе замаразак, — няпэўна сказаў Аляксей.

— Ага, — згадзілася яна і нечакана для Аляксея кранула яго за рукаў гімнасцёркі. — Алёша, гэта праўда, што не ўмееце танцаваць?

— Праўда.

— Калі хочаце, я навучу вас. У нас у арцелі ёсць патэфон і пласцінкі. У панядзелак я прынясу іх дамоў... Згодна?

— Добра, — пагадзіўся Аляксей. — Толькі давайце будзем адзін аднаго называць на ты. Так яно будзе лепей...

Галіна ўсцешна ўсміхнулася, хацела нешта сказаць, але якраз у гэты час у дзвярах бразнула клямка, пачулася папераджальнае "кхе-кхе" — на ганак ішоў Сашка. Аляксей кіўнуў галавой — "Дабранач!" — і пайшоў. Упоцемку, за вушаком, на суседнім ганку ён хутка намацаў дзяржальна нутраной засаўкі, каб адчыніць дзверы, і раптам да яго слыху данёсся рэзкі голас Галіны: "Не лапай!" І тут жа ляснула аплявуха. Аляксей не здужаў сябе — азірнуўся.Сашка трымаўся рукой за шчаку, а Галіны побач ужо не было.

Хто б мог падумаць, што незнарок сказанае Аляксеем слова стане яго мянушкай. Цяпер да "аглоблі", "старшага куды пашлюць", і "самага адказнага паставога" прыбавілася яшчэ адна мянушка — "трактар". Галіна першай пачула яе і, абураная, ледзьве

ўтрымалася ад слёз. Неяк Сашка заступіў ёй дарогу, калі вярталася з работы, і развязна загаварыў:

— Прывітанне,таварыш "педагог"! Як там пажывае твой "трактар"?

Яна адразу зразумела што да чаго. І, хаця была ўжо зіма і твар апякаў ладны марозік, ёй стала да млоснага горача: ажно верхні гузік на плюшавай жакетцы расшпіліла.

— Што ён табе благога зрабіў? Чаму ты такі, Сашка? Ён жа слаўны хлопец: на работу ўладкаваўся, вучыцца пайшоў...

— Чуў ужо, —злосна перабіў Сашка. — Далёка пойдзе, калі міліцыя не спыніць. Адразу ў начальства лезе... Старшыня сельпо. Падумаеш... Між іншым, можаш лічыць сябе забяспечанай...

— Паскуда — вось хто ты! — не стрымалася Галіна, рэзка павярнулася і пайшла прэч — шпарка, подбегам.

Аляксей ужо чакаў яе. Дапамог зняць жакетку, пасадзіў бліжэй да грубкі, дзе цяплей, сам папрасіў дазволу закурыць. Хіба яна будзе пярэчыць? Куры на здароўе. Ёй нават падабаецца, калі ён курыць. Дзяўчаты сёння ў другой змене, і Казіміраўна ўпраўляецца адна. Яна дастала з грубкі гаршчочак з бульбай, высыпала яе ў міску, паставіла на стол побач з баханкай-"цаглінкай" хлеба. Потым прынесла сала і капусты, запрасіла Галю і Аляксея на вячэру. А хіба ён будзе пярэчыць! Яму прыемна пасядзець з ёй за адным сталом, выпіць па алюмініевай кружцы самаробнай кавы з сахарынам, для прыліку забеленай малаком. А пасля — гаварыць і маўчаць, зноў маўчаць...

Пройдзе яшчэ колькі гадоў, можа, дзесяцігоддзяў, пакуль яны зразумеюць Казіміраўну і будуць самі, як цяпер яна, наравіць маладым людзям застацца ўдвох. Сам на сам. Не ў гэтай хаце — ва ўсім свеце. І ўвесь гэты свет будзе толькі іх светам і толькі для іх, для дваіх... Як, якімі пуцявінамі ты прыходзіш, каханне? Хто асмеліцца беспамылкова адказаць? Не нарадзіўся яшчэ такі празорлівец, такі мудрэц, такі вяшчун. Затое ўсе ведаюць: прыходзіць тады, калі яны — удвох.

Даўно прыбраны няхітры посуд са стала, нябачна і нягучна, як прывід, знікла бабка Эля. Зноў — у

каторы раз! — спявае старая заезджаная пласцінка — "Мне бесконечно жаль твоих несбывшихся мечтаний"... А іх двое. Толькі двое. І яшчэ вочы і вусны. Вочы не ўмеюць маўчаць: "Ой, няўмека, зноў наступіў на нагу. Хоць і ў шкарпэтках, але ж балюча". І тут жа: "Смялей, любы мой, не саромейся мяне". Вуснам лягчэй, у іх свая доля; сцятыя, яны не выпусцяць ні слова. Але ў вушах гучыць Барысава песня: "Губы твае, як макі". Думаецца: "Ці не табе ён спяваў гэту песню?"

— Усё, Алёша, — стомлена гаворыць Галіна, — "педагог" табе больш не патрэбны. Стаўлю "чацвёрку" з плюсам. — Уздыхае і апускае вочы. — У нядзелю, я чула, у клубе леспрамгаса будуць танцы. Як заўсёды, увечары. Так што запрашай мяне... Калі хочаш, канечне...

— Ну што ты гаворыш! — ён горне яе да сябе, але цяпер яна ўпіраецца ў грудзі рукамі, адводзіць убок вочы, хаця яму дужа хочацца паглядзець: што там у іх? — У нядзелю, кажаш?.. Увечары?.. У мяне ж у нядзелю сход пайшчыкаў у Рэвічах. І таксама ўвечары. Аднак нічога. Я паспею. Прыбягу прама на танцы.

Ён не сумняваўся, што абавязкова патрапіць на свае першыя "афіцыйныя" танцы. Сход пачаўся раней, чым планавалася, бо ў клуб, дзе ён праходзіў, неяк адразу прываліла столькі людзей, у асноўным жанок, — пальца не ўваткнеш. Прамову новага старшыні сельпо, яго слушныя прапановы паляпшэння гандлю на сяле вяскоўцы ўхвалілі, ахвотна выбралі сваіх упаўнаважаных-пайшчыкаў на раённы сход. Старшынствуючы, сакратар Рэвіцкага сельскага Савета, ужо абвясціў сход закрытым, калі з задніх радоў, дзе скучыліся адны дзяўчаты ў вышываных кажушках, нехта папрасіў старшыню сельпо расказаць сваю біяграфію.

— Новы вы ў нас чалавек, — спрабавала гранічна строга гаварыць адна маладзіца. — Хочам пазнаёміцца...

Аляксей узняўся з-за стала ў прэзідыуме, усміхнуўся вышываным кажушкам і сказаў, наколькі мог, моцна: "Нежанаты!" Выбухнуў смех, заднія рады адчайна заапладзіравалі. Наўкруга ў момант стала шумна, весела, як на кірмашы.

Ужо сутонела, калі выходзілі з клуба. Над Рэвічамі скавытаў вецер — пачыналася завіруха. Сакратар сельсавета, пажылы мужчына на мыліцах, прыдзірліва паглядзеў на Аляксеевы ногі ў хромавых ботах, на шапку з чырвоным аколышкам, незадаволена пакруціў галавой. Запрасіў Аляксея нанач, але той наадрэз адмовіўся і дадаў, што за адну гадзіну нават у такое надвор'е асіліць шэсць кіламетраў да райцэнтра.

За вёскай вецер быў яшчэ мацнейшы. Бесперастанку валіў густы, ахлапісты снег. Дарога ўгадвалася толькі па рэдкіх дрэвах, што чарнелі наўзбоч засыпаных снегам кюветаў. З кожным крокам ісці станавілася ўсё цяжэй і цяжэй. Крыссё шыняля, як пад ветрам бялізна на вочапцы, матлялася ва ўсе бакі. Пачыналі стыць калені, дранцвелі рукі ў тонкіх вязаных пальчатках.

Кіламетры за два ад Рэвічаў Аляксей нечакана наступіў на нешта слізкае, ледзь было не выцяўся пасярод дарогі. Прыгледзеўся... І толькі тады ўразумеў, што на дарозе ляжыць чалавек, што наступіў ён на дзеравячыну ягонай куксы. Зацярушаны снегам чалавек спаў. Аляксей не адразу раскатурхаў яго. Калі ж чалавек праснуўся, пачаў злосна лаяцца, абражаць: "Адстань, салага!.. Адчапіся, шчанюк!.. Маць тваю туды-растуды!.." І ні слова пра сябе, пра тое, куды ідзе, хто сам будзе. Апрануты ён быў у доўгі аўчынны кажух, шапка-аблавушка, завязаная матузкамі пад барадой, залезла на вочы, з-пад пахі тырчэла дэрмацінавая сумка з пачкам папер і правізіяй. Ад яго яшчэ здаля патыхала сівушным перагарам.

— Ану, перастань валяць дурня! — прыкрыкнуў Аляксей і падняў чалавека. — Табе куды?.. У Рэвічы?.. Не хочаш ісці?.. Не цалавацца ж мне з табой... Пайшлі.

Яны падаліся ў бок Рэвічаў. Хвілін праз колькі незнаёмец трохі акрыяў, разгаварыўся, назваў сябе Іванам, былым артылерыстам. Ён, аказваецца, быў у гасцях на хутары, парадкам там выпіў і вырашыў падвечар адправіцца ў райцэнтр, каб "злавіць" ваенкома і яшчэ раз паспрабаваць "выбіць" новы пратэз. Жыў ён адразу за сельсаветам разам з малодшай сястрой.

Апошнія паўкіламетра Аляксей нёс былога артылерыста на сабе. Зусім з сілы выбіўся, пакуль дапяў да хаты, у вокнах якой, нягледзячы на позні час, яшчэ мігцела святло. На голас Івана — "Любка, адчыняй!" — з сенцаў у белай сарочцы паказалася жанчына, войкнула, угледзеўшы чужога чалавека, і знікла ў цёмным праёме дзвярэй. Аляксей занёс Івана ў хату, пасадзіў на кушэтку-самаробку. Тым часам Люба, сунуўшы босыя ногі ў валёнкі, накінула наапашкі кажух, падкруціла ў лямпе кнот. Божкаючы і праклінаючы сваю і братаву долю, яна сцягнула з Івана шапку-аблавушку, кажух, села побач на кушэтцы і заплакала наўзрыд, захінаючы твар рукамі.

— Любка, не плач, — прасіў Іван. — Зароку не даю, але канчаю піць. Чуеш: кан-ча-ю. — Памаўчаў, пачухаў няголены кадык і паказаў пальцам у запечак. — Любка, падай мне... там... у шкапчыку.

Сястра паслухмяна ўзяла з шафы паўлітроўку і шклянку, паставіла на стол і толькі тады зірнула на Аляксея. У яе вачах адразу ж прамільгнуў спалох. Яна па-жаночы працяжна войкнула, ашчаперыла твар рукамі і выскачыла з хаты, як на пажар, нават дзверы не зачыніла. З парога крыкнула Аляксею:

— Распранайся! Хуценька! Вушы адмарозіў. Усе чыста белыя...

Тут жа, у парозе, Люба церла снегам Аляксеевы вушы, твар, шыю, пыталася, ці "чуе" ён пальцы на нагах, завіхалася, як ля малога. Нарэшце, вушы загарэліся агнём, і ён сказаў Любе пра гэта. Яна палегчана ўздыхнула, падвяла Аляксея бліжэй да лямпы, пакратала вушы халоднымі, як лёд, пальцамі і пачала выціраць ручніком. Цяпер ён мог бліжэй разгледзець яе твар. Быў ён шараваты, як недабеленае палатно, але нейкі свойскі, прыемны твар. Кінуліся ў вочы белыя, як часнок, зубы і поўныя, быццам прыпухлыя, губы; на высокі лоб спадалі кудзеркі каштанавых валасоў.

Іван тым часам расцянуўся на кушэтцы і спаў спакойным сном праведніка.

— Пагрэцца хочаш? — спытала Люба, паказваючы рукой на некранутую паўлітроўку.

Аляксей адмоўна пакруціў галавой.

— А есці будзеш?

— Не хачу. Мне трэба ісці.

— Абсохні хаця б.

— Не, пайду.

— Змерзнеш дзе-небудзь па дарозе. Што мне потым сказаць людзям?

— Не змерзну, не бойся.

— Чаго мне баяцца. Адбаялася сваё... Мы з табой аднагодкі Аляксей Фаміч. Я была на сходзе, слухала цябе. Ты вось яшчэ нежанаты, а я ўжо шосты годзік удавой сланяюся па гэтай хаце.

— Што ж паробіш... Маладая яшчэ, выйдзеш замуж.

— Ха-а,замуж. Цяпер дзевак хоць гаць гаці. Каму бабы патрэбныя.

— Ты ж прыгожая. От прычоска якая.

— Валасы секліся, дык завіўку зрабіла... Пасядзі, абсохні хаця б.

Непрыкметна для сябе Аляксей уцягнуўся ў размову, згадзіўся перакусіць і ачнуўся толькі тады, калі ўбачыў, што мінутная стрэлка ходзікаў (яны віселі напроціў, на сцяне) апісала поўны круг на цыферблаце. Была дванаццатая гадзіна — для зімы час даволі позні. Пра танцы ён ужо не думаў. Не забыўся — проста стараўся не думаць. Люба аказалася цікавай субяседніцай, і ён пачынаў разумець, што калі зараз жа не пойдзе, то можа ўважыць яе просьбу і... застацца. Яна ані не саромелася яго, гаварыла як з роўняй. Яе ні кропелькі не бянтэжыла тое, што сядзіць яна з незнаёмым чалавекам у адной сарочцы, што накінуты наапашкі кажух час ад часу спаўзае з плячэй, расхінае высокія грудзі.

— Пайду, — Аляксей узняўся з-за стала, пачаў апранаць шынель.

— Астанься, — амаль шэптам папрасіла Люба. — Астанься!.. Валасы твае хоць абсохлі?

Яна падышла бліжэй, утапіла пальцы абедзьвюх рук у яго шавялюры і моўчкі прыпала галавой да грудзей. Кажух зваліўся з плячэй — ён не паспеў падтрымаць яго, і Аляксей тут жа адчуў, як плечы яе лёгка ўздрыгваюць.

— Не трэба, Люба. Не трэба.

Яна яшчэ мацней прыціснулася да яго, ніжэй нахіліла галаву і абсыпала яго шыю, твар, вусны гарачымі пацалункамі. Моўчкі, без адзінага слова.

— Не трэба, Люба, — паўтараў Аляксей, — не трэба... Не магу я так... Людзі мы з табой, чалавекі. Сярод людзей жывём... Не магу я так...

Ад гэтых слоў яна ўся скаланулася, адпусціла яго галаву і сказала ўбок, як прыгавораная да непазбежнага пакарання:

— Даруй... за слабасць. Хаця і рэдка, але бывае такое. — Махнула рукой. — Ды хіба табе зразумець удовіну долю?..

А што яе, уласна кажучы, разумець. Удовіна доля —камяністае поле. Не тое поле, дзе аруць і сеюць, а поле жыцця. Усяго жыцця! З яго сінявокімі, але золкімі ці дажджлівымі ранкамі — для яе; з яго пагоднымі, але млоснымі ад бясконцай патугі днямі — для яе; з яго салаўінымі, але маркотнымі ад зморы вечарамі — для яе; і, нарэшце, з цнатліважаданымі, але такімі няўтульнымі і бяссоннымі начамі — зноў-такі для яе, для ўдавы. Удаве і паслізнуцца нельга: скажуць, п'яная. Удава ў вёсцы — што неба: ва ўсіх на віду. Вось і цяпер. У многіх хатах яшчэ свецяцца вокны. Што ў гэтым асаблівага? Нічога. У кожнага свой клопат. Але — можна смела паручыцца — толькі да шыбаў удовінага акенца, заклееных парудзелымі шпалерамі, ужо даўно прыліплі цікаўныя вочы, каб усё бачыць, усё пачуць, а ранкам, перш чым пусціць па свету яшчэ адну пагалоску, прыбавіць столькі, паўстолькі і чвэрць столькі да ўбачанага і пачутага. І нічога не зробіш: пагалоска не птушка — у сіло не завабіш.

У клубе леспрамгаса грымелі танцы.

Клуб быў новы, толькі што збудаваны. Крэслаў у ім яшчэ не было, і леспрамгасаўцы на ўсякі выпадак прывезлі аднекуль з глыбіннага лесаўчастка дзесяткі два даўжэзных лавак з прыбітымі пасярэдзіне дошкамі-падпоркамі, каб не прагіналіся. Цяпер гэтыя лаўкі (спараныя, каб ямчэй было сядзець) стаялі ўздоўж усіх чатырох сцен, і на іх сарамяжліва ціснуліся адна да адной па-ўсякаму апранутыя дзяўчаты: у танненькіх сукенках, кофтачках і спадніцах,радзей — у габардзінавых і шавіётавых касцюмах; хто ў туфлях ці чаравіках, а хто — у валёнках і нават у салдацкіх кірзавых ботах. Танцы былі бясплатныя, і моладзі, пераважна дзяўчат, сабралася

дужа многа — чалавек паўтараста. Месца на лаўках усім не хапіла, і дзяўчаты купкамі стаялі каля парога. Хлопцы, чалавек дваццаць, акупіравалі невысокую сцэну, дзе спаважна, як самыя ганаровыя госці, сядзелі музыкі: баяніст, скрыпач і барабаншчык з маленькім, як падсітак, барабанам у руцэ.

Галіна прыйшла на танцы разам з Ядвігай, сваёй стрыечнай сястрой, адшукала сяброўак па кватэры — Надзю, Зіну, Кацю, і цяпер яны ўпяцёх, таксама асобнай купкай, стаялі непадалёк ад сцэны.

Усімі тут верхаводзіў Сашка. З'явіўся ён у доўгім, да пят, кажуху з дзядзькавага пляча, у купленай шапцы-вушанцы з доўгім ворсам і ў тым сваім модным гарнітуры, які быў увесь на засцёжках. Важна прайшоў да сцэны, распрануўся, пільна і доўга бегаў вачамі па зале — некага шукаў, потым пазваў пальцам Барыса Кірэйку. Той адмахнуўся —маўляў, пачакай,заняты. Тады Сашка на мігах паказаў яму нешта і гучна скамандаваў: "Вальс!"

Закружыліся першыя пары. Барыс запрасіў на танец Ядвігу. Сашка яшчэ трохі павагаўся —паглядзеў па баках, патупаў каля сцэны, нарэшце элегантна схіліў галаву перад Галінай.

Увесь той вечар ён не адыходзіў ад Галіны ні на крок, быў, як ніколі раней, пачцівым і ласкавым. Танцаваў толькі з ёй, прычым танцаваў усё запар, што гралі музыкі, — вальс, польку, кракавяк, падыспань, танга. Барыс Кірэйка круціўся каля яго як на прывязі, стараўся ва ўсім дагадзіць. Але рабіў ён гэта так сабе,для віду; на самай жа справе Барыс падбіваў клінкі да Ядвігі. Сёстры раз-пораз пазіралі на дзверы, калі тыя адчыняліся ці зачыняліся.Сашка прыкмеціў гэта і шапнуў Галіне на вуха, вальсуючы з ёй:

— Не пазірай на дзверы. Пайшоў твой "трактар" араць на другое поле.

— Не называй яго гэтак, — пакрыўдзілася Галіна.

— Добра, не буду, — згадзіўся Сашка. Памаўчаў, кружачыся ў танцы, і зноў зашаптаў на вуха: —Ён у Рэвічах сёння, сход праводзіць... Думаецца мне, працягваецца той сход на падушках якой-небудзь маладзіцы.

Галіна адхіснулася ад яго, перастала танцаваць.

— Не мерай усіх на свой аршын.

— Усё, не буду больш, — пакаяўся Сашка, але ў хуткім часе зноў мармытаў каля вуха: — Вабшчэ-та ён неблагі хлопец. Я чытаў яго артыкулы ў раёнцы. Талкова, скажу табе, напісана. З працягам было, у трох нумарах...

— Якія артыкулы? — Галіна зірнула яму ў вочы.

— Няўжо не пахваліўся?

Яна прамаўчала.

— Пра нашых мілавіцкіх гандляроў напісаў. Складна так, нават я дачытаў да канца. А дзядзька мой быў у захапленні, услых чытаў... Я толькі аднаго не разумею: як гэта ён у дзесяты клас пайшоў? Сам казаў, што да вайны ўсяго сем класаў скончыў.

— Ці не думаеш ты на яго ананімку напісаць? — з насмешкай спытала Галіна.

— Прычым тут ананімка? — зморшчыўся Сашка. — Я сапраўды не разумею.

— Што тут не разумець? — Галіна зноў паглядзела яму ў вочы. — Ён і ў арміі марна часу не траціў, завочна скончыў тры курсы педвучылішча. Цяпер пайшоў у вячэрнюю школу. Настаўнікам не хоча быць.

— А кім жа ён хоча быць?

— Не знаю. Спытай у яго.

Сашка змяніў тэму гаворкі, але яна ўжо не слухала яго. Кружылася ў танцы лёгка і азартна, быццам толькі і жыла гэтымі танцамі. Між іншым, Сашка менавіта гэтак і думаў, таму стараўся як толькі мог.

Ах, Сашка! Які ж ты завадатар, калі не бачыш, не здатны зразумець, аб чым гавораць яе вочы? "Што магло здарыцца? Што? Ты павінен быў прыйсці. Ты не мог не прыйсці сягоння. Я так чакала цябе, так верыла... Мне не здалося ўчора, не! Ты сапраўды хацеў мяне абдымаць. Божа мой, якая я дурніца: уперлася рукамі ў грудзі. Ядзя таксама сказала — дурніца. Я ж так хацела, каб ты абняў мяне. Якія дзівакі гэтыя хлопцы. Скажы ім: не люблю цалавацца — паверацъ. Умора! Дзе вы бачылі дзяўчыну, якая не любіла б цалавацца? Хіба што ў кіно. Ці бязглуздая якая. Лепей не павячэраць, абы нацалавацца з любімым дасхочу... З любімым? А ці любіць ён мяне? Можа, Сашка праўду сказаў? Хіба мала ў тых Рэвічах дзяўчат? Не, не можа быць... Ён не падобны на такога.

— Перастань ты пазіраць на дзверы, — зноў над яе вухам Сашкаў голас. — Не прыйдзе ён. Ужо, напэўна, другі сон бачыць... Хаця — ха-ха-ха — на дзявочай падушцы адразу не заснеш.

"Злы ўсё-такі ты, Сашка, злы. І злуеш не на Аляксея — на самога сябе. Злуеш таму, што ён лепшы за цябе. Хаця і з цябе можа быць толк. Ядзя, відаць, мае рацыю: калі цябе ўзяць у рукі, будзеш шаўковым..."

Аб гэтым і думала яна, калі ішлі з танцаў. Сашка асцярожна падтрымліваў яе пад руку, маўчаў. Паперадзе беглі Зіна, Каця і Надзя. У іх нешта разладзілася са сваімі кавалерамі, і яны гэтаксама ішлі моўчкі. Барыс пайшоў праводзіць Ядзю, а Віцька і Сярожа недзе згубіліся ў натоўпе, як выходзілі з клуба. Зіна разы са два азірнулася — ці не даганяюць праважатыя, іх не аказалася, далей ішлі моўчкі,без аглядкі. Завіруха гэтак жа раптоўна, як і ўсчалася, аціхла, вецер аслаб, і ў прагалах між хмар холадна пабліскваліі па-зімоваму буйныя зоркі. Перад самым ганкам Сашка прытрымаў Галіну за рукаў жакеткі:

— Пачакай.

— Чаго?

— Пастаім трошкі.

— Холадна стаяць.

Сашка яшчэ загадзя расшпіліў кажух, прыгарнуў дзяўчыну да сябе, ахінуў цёплым крысом.

— Пусці! — вырывалася Галіна з абнімкаў. — Што дзяўчаты скажуць...

— Хай кажуць... Што заўгодна... Мне пагаварыць трэба... Дай толькі з духам збяруся.

Калі б хто збоку назіраў за Сашкам, не пазнаў бы яго. Такі зух-хлопец, такі гаварун, як магло здацца любому, раптам стаў ціхмяным і маўклівым. Ён стаяў і маўчаў, быццам у яго адняло язык. І хто ведае, колькі б ён яшчэ ўздыхаў і маўчаў, калі б да веснічак подбегам не падышоў Аляксей. Заснежаны з галавы да ног, ён захінаў рукамі вушы.

— З'явіўся твой "трактар", — буркнуў Сашка пад нос. — Выспаўся...

Галіна адхіснулася ад яго, стала папраўляць свой белы пуховы бярэцік. І тады Аляксей пазнаў іх. Збянтэжана павярнуўся і пайшоў назад, уздоўж па вуліцы. Хвілін праз колькі ён вярнуўся. Сашкі ўжо

не было. Галіна стаяла на ганку. Адна. Чакала. Аляксей намацаў у кішэні ключ ад свайго кабінета, раптам узрадаваўся неспадзеўкі прамільгнуўшай думцы і пашыбаваў у бок канторы сельпо.

Печы ў канторы палілі звечара, і ў кабінеце было горача, але — падалося — трошкі чадна. Аляксей распрануўся, павесіў шынель і шапку на вешалку-стаячок каля дзвярэй, прысеў на рыпучую канапу, што дасталася ў спадчыну ад былога старшыні сельпо, сілком адпраўленага на пенсію. Расшпіліў каўнер гімнасцёркі. Закурыў. Лямпу не стаў запальваць — навошта турбаваць вартаўніка. Цяпер ён недзе на рагу вуліцы, каля магазінаў, убачыць святло — прыбяжыць. Лішнія турботы: тлумач потым чалавеку — што і чаму?

У кабінеце сапраўды было чадна. Гаркавы дымок непрыемна казытаў у носе, і Аляксей адчыніў фортку ў акне. З вуліцы шуганула марознае паветра, аж скаланула ад бадзёрай свежасці. Дакурыў папяросу, патушыў акурак у попельніцы на падаконніку, прычыніў фортку. Вочы паступова асвойталіся з цемрай, і цяпер ён ужо даволі выразна бачыў свой стол, мармуровы чарнільны прыладак на ім. Падышоў да бакавых дзвярэй, адчыніў адну створку. Гэтыя дзверы вялі ў бухгалтэрыю. Ні былы старшыня, ні ён, Аляксей, не зачынялі іх на ключ. Сюды звычайна заходзілі бухгалтар, планавік і таваразнаўцы з паперамі на подпіс. Калі старшыні не было, паперы пакідалі на стале. Што ж датычыцца наведвальнікаў (а яны тыя разы валам валілі да старшыні спажывецкага таварыства), усе карысталіся асноўнымі дзвярамі — з калідора.

Аляксей зазірнуў у бухгалтэрыю, прайшоўся паміж сталамі. Яны стаялі літарай П: па чатыры — просценькія, канторскія — з двух бакоў паўз сцяны, а ў сярэдзіне, ад прасценка, — шырокі, з дзвюма тумбамі, стол галоўнага бухгалтара. З такім жа, як у старшыні, чарнільным прыладкам. На астатніх сталах і ў цемры выразна ўгадваліся звычайныя чарнільніцы-невылівачкі. Падумаў: "Усё роўна як у школе. Скнара быў мой папярэднік. На рахунку ў банку больш за сто тысяч, а па-людску абсталяваць кантору не дазволіў". Вярнуўся назад у кабінет. Скінуў боты. Прылёг на канапу.

З гадзіну Аляксей круціўся на канапе — і на левы бок, і на правы, а сон не ішоў. Перад вачамі няўмольна паўставалі падзеі апошніх дзён. Першым чамусьці прымроіўся ваенком. Высокі, зусім сівы падпалкоўнік працягнуў ваенны білет: "Віншую, таварыш сяржант запасу першай катэгорыі. Вы былі добрым салдатам. Жадаю заставацца такім жа і ў цывільным жыцці — стойкім, прынцыповым і сумленным. Ва ўсім! — усміхнуўся па-бацькоўску, цёпла і дадаў: — І ў каханні таксама. Гэта вельмі важна..." На змену ваеннаму камісару прыйшла Галіна. Здалося, што ён адчуў дотык яе рукі: "Алёша, гэта праўда, што не ўмееце танцаваць?.. Калі хочаце, я навучу вас..." Асабліва доўга "не адпускала" Люба. Ён усё яшчэ, як наяве, адчуваў яе халодныя, нібы лёд, рукі, чуў ціхі шэпт: "Астанься... Астанься... Астанься". А пацалункі? Толькі цяпер Аляксей зразумеў, чым пахлі яе губы — малаком... Ужо было амаль што задрамаў, як зноў "прыйшла" Галіна: "Усё,Алёша... "Педагог" табе больш не патрэбны... Стаўлю "чацвёрку" з плюсам. Так што запрашай мяне... Калі хочаш, канечне..."

Попельніца ўжо з коптурам была завалена акуркамі, а сон не прыходзіў. Наадварот, ён адляцеў зусім, саступіўшы месца думам — ліпкім і цягучым, як смала: колькі ні стрэсвай — не адчэпіцца... "Як мне зразумець цябе, каханне? Дзе ты сапраўднае, а дзе фальш, міраж?.. Галя! Па вачах бачу: горнешся да мяне, чакаеш. І ў той жа час "абдымаху рэзаць" ідзеш з другім. Чаму?.. Ах, каханне! Слодыч і горыч людская, спрадвечная загадка роду чалавечага. Хто адгадае яе? Эзоп, кажуць, і той адмовіўся.А ці варта ўвогуле адгадваць? Навошта? Без сваёй загадкавай таямнічасці яно, напэўна, згубіць самае галоўнае — святасць, як першародную аснову. А чым замяніць яе? Усё той жа практычнасцю? Ці яшчэ чым? Даруйце, але гэта аднолькава немагчыма, як немагчыма напіцца нават з самага ўмела намаляванага кубка..."

На сконе ночы, пад раніцу, мароз узмацніўся, за вокнамі зашастаў парывісты вецер. Нават у суцінках было бачна, як шыбы вокнаў ахутала шэрая наледзь, і ў кабінеце яшчэ больш пацямнела. А думы не адступалі, лезлі напралом, адганяючы і стому, і сон адначасова... "Як жа мне ўсё-такі зразумець цябе,

каханне, як ставіцца да цябе? Самы раз было б з кім-небудзь параіцца. Смех дый толькі — параіцца! Каханне — неацэнны дар, вялікі сакрэт, нават тайна, пра якую самому сабе прызнавацца рызыкоўна. Заўчасна прызнацца — што камень кінуць у чыстую ваду: скаламуціш са дна. А каханне, калі яно сапраўднае, павінна быць празрыста-чыстым на ўсю глыбіню. Адно што ісці за ім нельга з працягнутай рукой. Нават калі і "пажалуюць" яго — які ж гэта будзе дар? Гэта падачка ўжо, якая рана ці позна засядзе ў горле шорсткім камяком".

Думы нечакана спудзіла электрычнае святло, якое ярка ўспыхнула ў бухгалтэрыі. "Усё зразумела, — падумаў Аляксей. — Бухгалтарка сядзела над балансам да дванаццаці, а зараз, выходзіць, сем гадзін раніцы. Упарылася яна з гэтым балансам, выключальнікам шчоўкнуць забылася". Лёгка ўскочыў з канапы, апратаў споўзшыя з галёнак шарсцяныя шкарпэткі —падарунак сястры, нацягнуў боты. Па армейскай звычцы тут жа, каля канапы, зрабіў фіззарадку і ўжо хацеў было пайсці выключыць святло, як у калідоры затупалі нагамі, абтрасаючы снег. Па голасе пазнаў планавіка Люду. Напяваючы сваю любімую "Сямёнаўну", — "Ах, Сямёнаўна, мая ты мілая..." — яна адамкнула дзверы ў бухгалтэрыю, з парога кінула на стул свой палітон, палезла ў шафу па лічыльнікі і паперы. Аляксей не паспеў і вокам маргнуць, як стол планавіка быў завалены грувасткімі папкамі з дакументамі. Люда манерна ўселася за стол, на паўголаса заспявала:

А самалёт ляціць,
Ды ўсё калых-калых.
Мальцы хітрыя,
А мы хітрэй за іх.

.....

— О-о-ой! — ускрыквае Люда. — Хто там?

— Гэта я, Люда, — Аляксей паказваецца ў дзвярах, паволі папраўляе рэмень на гімнасцёрцы. — Добрай раніцы.

— Добрай раніцы, Аляксей Фаміч. Вы... даўно тут?

— Сама бачыш: толькі прыйшоў.

— А я... А мы... Мы ўчора з Надзеяй Паўлаўнай гадавую статыстычную справаздачу заканчвалі. Я на

танцы пабегла, а яна яшчэ заставалася. Сёння я раней прыйшла, каб перапісаць... Добры ў нас, Аляксей Фаміч, бухгалтар. Яна — як маці. І паўшчувае, калі трэба, і пашкадуе.

— Скора ёй на пенсію? — пытае Аляксей, хаця добра ведае, што да пенсіі бухгалтару яшчэ цэлых пяць гадоў.

— Яна кажа, што не пойдзе на пенсію. Ёй дужа падабаецца з намі. Дайжа не думайце, не пойдзе.

— Я нічога благога не думаю, — усміхаецца Аляксей. — Хай сабе працуе з намі... Ну, а як там на танцах было?

— Ой, каб вы бачылі, Аляксей Фаміч, — пачынае расказваць Люда. — Наро-о-оду — поўны клуб! Да самай поўначы танцавалі. Шкада, што святло рана выключаюць.

— Скора не будуць выключаць. Другі дызель ужо прывезлі.

— Вось добра! Хутчэй бы, — уздыхае Люда і адводзіць вочы ўбок. — Паказвалі мне ўчора адну дзяўчыну... Адным словам, вашу Галку бачыла. Прыгожая яна, Аляксей Фаміч. Самая прыгожая была на танцах. Увесь вечар на дзверы пазірала. Сашка — ведаеце яго? — увіваўся каля яе, як кот. Казалі, праводзіць пайшоў.

— Як гэта ў вас атрымліваецца: мая, а праводзіць ідзе другі?

—Бывае такое, Аляксей Фаміч, бывае. Такая дзявочая доля: падабаецца адзін, а ісці мусіш... з кім патрапіць.

— Не разумею, чаму — мусіш?

— Ой, што там казаць,—махае рукой Люда.— Вам, мужчынам, лягчэй жыць. За вамі права выбару. Вы ад жанчыны, калі што якое, заўсёды знойдзеце лекі.

— Цікава: якія ж гэта лекі?

— Бытта не знаеце? Ад жанчыны ёсць адны лекі — жанчына.

У калідоры зноў цяжка бухаюць нечыя валёнкі — страсаюць снег. І на парог ступае Надзея Паўлаўна. Яна ў зімовым паліто, са здаровым румянцам на ўсю шчаку. Вітаецца з Аляксеем за руку, Людзе хітнула галавой — "Дабрыдзень!"

— Можаце мяне павіншаваць, Аляксей Фаміч, — сур'ёзна і трошкі ўрачыста гаворыць бухгалтар. —

Роўна ў дзевяць гадзін раніцы кладу вам на стол яшчэ адзін гадавы баланс. Так сказаць, юбілейны — трыццаты на маім вяку. І першы раз не буду сама пісаць тлумачальную запіску да балансу. У вас гэта лепш атрымаецца. — Надзея Паўлаўна хітра прыжмурвае левае вока. — Я рэгулярна чытаю газеты, у тым ліку і нашу, раённую.

— Добра, напішу запіску, — згадзіўся Аляксей і пайшоў да сябе, прычыніўшы за сабой створку дзвярэй.

Як многа ўсё-такі азначае жыццёвы вопыт. Будзь ты, як кажуць, хоць сямі пядзей у ілбе, а не май жыццёвага вопыту — грош цана тым пядзям. Жыццё — вось гэта акадэмія! Іменна акадэмія. І не бяда, што яна не выдае пасведчанняў, дыпломаў. Урэшце рэшт, справа не ў афіцыйных дыпломах. Страшна падумаць: што было б з намі, калі б побач не было "дыпламаваных" жыццём людзей! З іх глыбокімі, як памяць, ведамі, з іх памяркоўнай мудрасцю, нетаропкай разважлівасцю, з іх смешнымі — не бяда! — прыкметамі, большасць з якіх даўным-даўно абвергнуты і нічога, апроч спачувальнай усмешкі, не выклікаюць сягоння. Як хораша, як цудоўна, што яны ёсць, гэтыя людзі! Калі і варта цяпер маліцца, дык толькі ім. І словам, і сэрцам.

.....

Як ні стараўся Сашка, а "трактар" яўна "забуксаваў": не прыставала мянушка да Аляксея. Нават неразлучныя сябрукі завадатара адмовіліся падтрымаць яго "вынаходніцтва" — не хочам, сказалі, псаваць адносіны з гэтым хлопцам. І Сашка, добра падумаўшы, адступіў: "Хай сабе жыве без мянушкі". Тым больш, што і з Галкай ён не страчаецца. Як адсек: убачыў іх разам — не падышоў больш да яе.

Звяла ў зародку і рэвіцкая пагалоска. З ёй атрымалася ўвогуле дзіўная гісторыя. Замест таго, каб пошапкам па завуголлю смакаваць "хітрыкі" маладой удавы і новага старшыні сельпо, дзён колькі пра Аляксея гаварылі з падкрэсленай пачцівасцю. Дзіва што! Выратаваў чалавека. Знайшоў на дарозе ўдрызг п'янага і прынёс дадому. Змерзнуў бы Іванка-артылерыст. Што ж тут такога, калі сястра пацалавала за такі прыстойны ўчынак! Усё, як гаворыцца, у ажуры...

У паўсядзённых клопатах непрыкметна міналі дзень за днём. Неяк адразу адступіў, аслаб мароз, уціхамірыліся завеі. На змену ім прыйшла адліга, такая жаданая ўзімку — хоць абдымай яе пасярод вуліцы, як чаканую госцю.

Прадвеснем Аляксею давялося пабыць у суседнім, Лунеўскім раёне. Там праводзілася першая пасля вайны куставая нарада старшынь спажывецкіх таварыстваў вобласці. Бывалыя арганізатары гандлю (зубы, што называецца, з'елі на гэтай рабоце) дзяліліся вопытам, вучылі такіх, як Аляксей, "жаўтароцікаў" правілам і прынцыпам работы спажывецкай каперацыі. Урэзалася ў памяць прамова аднаго даваеннага старшыні сельпо. Выступаць ён не ўмеў — "плёў лапці", сказаў Аляксееў сусед па лаўцы, але адчувалася, што чалавек хоча аддаць усё, набытае гадамі "катаржнай", як ён сказаў, сельпоўскай "крупадзёркі". Прахопліваўся гэты чалавек раней за жаўранка, а спаць клаўся амаль заўсёды пасля трэціх пеўняў, бо лічыў абавязковым для сябе правяраць работу не толькі баз, складоў, рамізнікаў-анучнікаў, прадаўцоў, але і начных вартаўнікоў.

Па прыездзе дамоў Аляксей таксама вырашыў праверыць сваю "вартавую службу". Пазаведамаснай аховы, як цяпер, тады яшчэ не было, і ў штаце сельпо налічвалася больш за трыццаць начных вартаўнікоў. У адным райцэнтры — пятнаццаць. Былі гэта пераважна пажылыя людзі або так, з якімі-небудзь заганамі — кульгавыя, глухаватыя, аднавокія. Усіх іх Аляксей ужо ведаў у твар, а вось праверыць непасрэдна на рабоце ўсё не ставала часу.

На праверку ён адправіўся а першай гадзіне ночы. Была якраз поўня. Снег ужо растаў, і пад нагамі ледзь чутна хлюпала раскіслая дарога. Пры святле месяца ісці было ніштавата — можна хоць абмінуць ці пераскочыць лужыны, а калі насунуліся хмары, загрувасцілі ўсё неба, на вуліцы стала зусім цёмна — хоць вока выкалі. Усё ж Аляксей без асаблівых прыгод выйшаў на ўскраіну, дзе побач з канторай лясгаса за невысокім плотам туліўся прыземісты дамок-магазін. Аляксей прайшоўся туды-сюды ўздоўж плоту, пастаяў, прыслухаўся, потым падышоў бліжэй да магазіна. Вартаўніка нідзе не было. Хацеў ужо было ісці назад, як з-за вугла яго аклікнулі:

— Гэта ты, Фаміч?.. А я думаю, каго гэта ў такую пару чэрці носяць?

З бярданкай наперавес з-за вугла высунуўся вартаўнік, дзядзька Васіль, рушыў да Аляксея; крокі за тры спыніўся, скінуў прыклад "к назе", цішком павітаўся: "Здравія жалаю, таварыш старшыня!"

— Зараджана? — паказаў Аляксей на бярданку.

— Па сакрэту, — нахіліўшыся, зашаптаў дзядзька Васіль, — маю толькі адзін патрон. Ды і той соллю зараджаны.

— Чаму соллю?

— Цяпер, пасля вайны, на чалавека рука не ўзнімецца. Усё роўна ўверх страляў бы. А так, калі што якое, — соллю можна, грэшным дзелам, і па азадку сцебануць. Хай тады ў начоўках вымочвае.

— Ведаеце, а я напачатку нядобра быў падумаў пра вас, — спрабаваў пажартаваць Аляксей. — Спіць, думаў, дзядзька Васіль дзе-небудзь у суседкі пад цёплай пярынай.

— Э-э-хе-хе! — уздыхнуў вартаўнік. — Адаспаў я сваё. Было, было дзела. Цяпер вы, маладзейшыя, выцірайце валасы на чужых падушках. А нам ужо няма чаго выціраць. — Дзядзька Васіль мігам скінуў заячую шапку-аблавушку, пачухаў голую, як калена, галаву. — Толькі з розумам... выцірайце.

— Як гэта — з розумам?

— Паспрабую ўтлумачыць, — вартаўнік задумаўся, працягнуў Аляксею кісет і складзеную гармонікам газету. — Я, грэшным дзелам, таксама нядобра быў падумаў пра цябе, Фаміч. Як сказалі, што ты ў Любкі ў Рэвічах быў, што яна галяком у цябе на шыі вісела — паверыў быў. Я знаў яе маці. Працавітая была баба, як пчолка, і гарачая, прыгожая — кроў з малаком! Толькі долі не мела. Ні сама, ні дзеці... Цяпер, чую, Любка сказала, што ўсё гэта — плёткі. Прыгразіла: калі хто скажа на цябе хоць адно благое слова — вочы выдзярэ. І ёй паверылі — плёткі. Я таксама паверыў.

— Усё не так было — сказаў Аляксей, прыкурваючы самакрутку.

— Знаю, што не так. Таму і кажу: жыць трэба з розумам. — Дзядзька Васіль прыкурыў ад Аляксеевай цыгаркі, закашляўся. — Плётак баяцца няма чаго: з ветру вяроўкі не саўеш. А вось падстаў для

іх, для плётак, даваць не варта. Выйсце, праўда, ёсць, але толькі ў адным — у пастаянстве. Я сам, грэшным дзелам, адно нядаўна ўразумеў, што самая смачная вада — са сваёй студні... Разумееш ты мяне, Фаміч? Дайшло, значыць?.. Калі на добры лад, па шчырасці, дык усе гэтыя фантанчыкі-нарзанчыкі — балаўство адно, не болей. Паказыча трошкі, пацешыць — і ўсё. А свая студня і цела ўсмак поіць, і душу... Бач, як месячык разгуляўся. А быў жа, валацуга, таксама зашыўся ў чужыя падушкі. На чорта яны здаліся! Знай сваё месца і — свяці! На радасць зямлі і людзям...

"Знай сваё месца... На радасць зямлі і людзям", — пра сябе паўтараў Аляксей, кіруючыся з ускраіны ў цэнтр горада. Ён не стаў даваць кругаля — упоцемку пайшоў цераз старыя могілкі з расхістанымі ў розныя бакі крыжамі, на якіх дзе-нідзе яшчэ матлялася ашмоцце ад ручнікоў-набожнікаў. Тупкая сцежка ў хуткім часе вывела яго на чыгуначную станцыю. Там, побач з вакзалам, шырокай, яшчэ даваеннай будовы хацінай, была і гандлёвая "кропка" — магазін харчовых тавараў. На вушаку вакзальных дзвярэй, трошкі вышэй як у рост чалавека, цьмяна гарэў газавы ліхтар. Пад ім — пазнаў здаля — мірна гаманілі дзяжурны па станцыі і сельпоўскі вартаўнік. "Не буду замінаць", — падумаў Аляксей і збочыў за пакгаўз, каб напрасткі падацца ў цэнтр горада.

Ісці давялося цераз ушчэнт зруйнаваны квартал. Толькі ў канцы яго ацалелі мураваныя сцены прасторнай пуні колішняга правізара, адгроханай перад самай вайной з чэсанага каменя. Днямі будаўнікі сельпо адвезлі туды латы і падводы з дзве дошак-аполак, каб зладаваць страху і прыстасаваць пуню пад склад рыззя ці макулатуры. "Пагляджу, ці не расцягваюць дошкі?" — падумаў Аляксей і скіраваў у той бок.

Удзень пажарышчы, асабліва печы з комінамі, выглядаюць не так змрочна, вусцішна, як уначы. Ноччу яны ўспрымаюцца як загубленыя істоты. Каля іх нават спыніцца хочацца. І думаецца не пра печышчы — пра людзей. Блага тады становіцца на сэрцы, век бы не бачыць такога.

Аляксей ужо ведаў, дзе і хто, на якім дворышчы жыў, што яны былі за людзі. Пра іх і цяпер згадвалі

гараджане, шчыра, па-чалавечы шкадавалі майстравых людзей. Вось гэта пажарышча рымара. Быў ён, расказваюць, заўсёды нейкі растрэпаны, шчупленькі, як напалову палінялы верабей. Але ж быў ён добры, душэўны чалавек. Гэта ў яго спыняліся на начлег знаёмыя і незнаёмыя людзі бадай што з усюль — з Дабраслаўкі, Люшчы, Сіняўкі, Бобрыка, іншых навакольных вёсак і мястэчак. Меў ён, расказвалі, такое рэдкае імя, што не паснедаўшы не вымавіш; імя не запомнілася, а вось дабрыня рымара, яго памяркоўнасць, прыязнасць да людзей, не кажучы ўжо пра "змайстраваныя навек" хамуты, сядзёлкі, збрую, будуць помніцца заўжды... А гэта комін Цылі, адзінай некалі швачкі-мадысткі ў Мілавічах. Гэта печ належала гарбару, страшэннаму скупечы, па-вулічнаму Абажанак. Побач з сырамятнікам, што стаяў упрытык да шыкоўнай пяцісценкі, ён змайстраваў нешта накшталт паветкі з мураваным склепам, дзе яго жонка з дзвюма дочкамі пяклі на продаж абаранкі. Ад сырамятніка круглы год патыхала цяжкім духам скур, а з-пад паветкі струменіў дурманячы пах здобы. Яшчэ задоўга да вайны гаспадар начапіў на дзверы сырамятніка вялізны замок і ўсю ўвагу скіраваў на здобу, асабліва абаранкі, як больш прыбытковую і немудрагелістую крыніцу даходаў. За гэта, відаць, і далі яму мянушку — Абажанак. Сядзіба гарбара згарэла датла, нават комін не вытрываў, разваліўся і забурыў палову печы. Цяпер адно яе абгарэлае чало, чорнае і моцнае, як жалеза, узвышалася над кучай пабітай цэглы. Непадалёк, амаль што ўпобачкі, зеўрыў дзвярны праём мураванага склепа. Над ім сіратліва мацавалася абгарэлая знізу бярозка. Сам склеп густа зарос чартапалохам і дзядоўнікам, і ўлетку яго хавала ад вока густая зеляніна. Зараз жа, прадвеснем, пры цьмяным святле месяца дзвярны праём склепа нагадваў пашчу ўтаптанага ў зямлю страшыдла.

Аляксей аж запаволіў хаду, пазіраючы на прыдуманае ім страшыдла. І якраз у гэты момант да слыху даляцеў ці то шоргат, ці то прыглушаны, як з-пад зямлі, размераны грукат у склепе. Аляксей стаіўся за абгарэлым чалом печы. Сцішыўся. Прыслухаўся. Так, яму не падалося: у склепе сапраўды нехта быў. І быў чалавек, бо разы са два Аляксей выразна пачуў

цяжкія, як бы старэчыя крокі. Чалавек асцярожна, па некалькі разоў запар ціхусенька грукаў то ў адным, то ў другім, у трэцім месцы, чуйна прыслухоўваўся і паўтараў свой незразумелы занятак зноў і зноў. Падыходзіць бліжэй Аляксей не асмеліўся, тым не менш цікавасць не пакідала яго. "Хто гэта можа быць? Што ён там робіць?" Падняў кавалак цагліны, шпурнуў у бок склепа. Цагліна патрапіла ў густы дзядоўнік, і з яго спалохана выскачыў вялізны чорны кот, працяжна мяўкнуў і стрымгалоў кінуўся як надалей ад склепа. У дзвярным праёме паказалася чалавечая постаць. Па чорнай ускудлачанай барадзе Аляксей пазнаў чалавека. "Ку-увель!" — ледзьве не сарвалася з языка.

Арон патаптаўся на прыступцы — перашкодзілі яму, яшчэ больш ссутуліўся і патэпаў чамусьці не дамоў, а ў бок чыгуначнай станцыі. "Замятае сляды, — падумаў Аляксей. — Выходзіць, праўду кажуць: шукае стары нешта на пажарышчах".

Каля пуні Аляксей затрымаўся нядоўга: дошкі-аполкі ляжалі на месцы,нікога нідзе не было. Ды і каму патрэбны гэтыя дошкі. Ужо чаго-чаго, а дошак, пасля таго, як пусцілі лесапільню, тут, у Мілавічах, колькі заўгодна. Якіх душа пажадае. І дваццатак, і трыццатак, і сараковак. Шмат чаго бракуе, а вось дошак — навалам, як гразі ўвесну.

Месяц па-ранейшаму ліў на зямлю сваё адвечнае, мяккае і загадкавае святло. Як блізарукі, ён мала што не чапляўся за дахі дамоў, цікуючы за ўсім, што рабілася на соннай вуліцы. Але не ўсе спалі ў гэты час.

На эльжбеціным ганачку цямнелі дзве стройныя фігуры. Па доўгіх спадніцах і плюшавых жакетках Аляксей адразу ж пазнаў Галю і Надзю. "Заканадаўцы моды, — нявесела падумаў пра іх. — Дзівачкі, як ад сябе не ўцячэш, так за модай не ўгонішся".

— Добры вечар, дзяўчаты, — павітаўся ён, зраўняўшыся з суседкамі.

Адказала Надзя.

— Добрай раніцы, Алёша.

— Няўжо — раніцы?

— Аняго ж. Хутка світаць будзе.

— Чаму ж вы тады не спіце?

Зноў адказала Надзя.

— Збіраліся спаць, ды сусед не даў.

— Які сусед? Я?

— Хто ж яшчэ. Чуем: пайшоў за веснічкі. Ціхенька так, крадком. Вось і стаім, гадаем: да каго наш сусед сёння падаўся на спатканне?

— Сторажаў правяраў, — Аляксей глянуў на дзяўчат, усміхнуўся: — На спатканні я не хаджу. Няма да каго хадзіць. Як той казаў: не тапчыце, ножкі, да дзявок дарожкі, пакуль сэрца па ёй не задрыжыць, а душа паперадзе не пабяжыць... Спакойнай вам ночы, суседачкі. — І ўжо са свайго ганачка кінуў: — І квяцістых сноў.

Краем вока паспеў згледзець, як Галя прытулілася да Надзінай шчакі і, здаецца, цалавала яе.

На рыпучай канапе, дзе сястра яшчэ завідна слала яму пасцель, Аляксей на гэты раз доўга не мог заснуць. Пра Кувеля ён забыўся адразу ж. А вось Галя неадступна стаяла перад вачамі. "Нешта не клеіцца ў іх з Сашкам... Паспытаць долі саперніцкай, ці што?.. Не, не трэба. Навошта гэты трохвугольнік?"

Вясна ў Мілавічах, як і скрозь на Палессі, пачыналася дружна. Амаль штогод яна прыходзіла сюды непрыкметна, быццам знячэўку выбягала з туману. Шчыльны (хоць ты пакратай рукой) туман на колькі дзён засланяў сабой наваколле, а калі ён — звычайна ранкам — рассейваўся, вясна ўжо ззяла наўкруг ва ўсёй сваёй красе. У навакольных лясах, па неглыбокіх прыдарожных кюветах, нават на агародах і на папялішчах густа зелянеў кураслеп — па-тутэйшаму "вяснуха"; у алешніку і на пагорках віднеліся залаціста-зялёныя плямкі чысцяку вясенняга, празванага "капыткамі" і "шпонкай" за форму лісцяў і вывадных пупышак; на ўзлесках (лес ушчыльную падступаў да гарадка), з-пад счарнелага за зіму лісця і пажухлай травы, побач з першынцамі раннецвету — медуніцай, гусінай цыбуляй, чубаткамі і падбелам, ужо прабіваліся дзівоснай прыгажосці цёмна-фіялетавыя званочкі сон-травы.

Уяўленне аб пачатку вясны будзе не зусім поўным, калі не згадаць яшчэ аб адным. З прыходам вясны і Мілавічы, і ўвогуле ўвесь гэты лясны край, пакуль не праходзіў вясенні шал, глухлі ад птушынай гаманы. Бяздомныя птахі ці то не знаходзілі прыстанішча

ў лесе, ці то проста імкнуліся ўладкавацца бліжэй да чалавечага жытла, незлічонымі чародкамі запаўнялі ўсе вуліцы, кожны двор. Яны з дакорам пазіралі на людзей, быццам ушчувалі: "Што ж вы, людцы добрыя! Самі ўладкаваліся, а як быць нам?"

Аляксей падгаварыў швагра памагчы яму змайстраваць пару шпакоўняў і павесіць на вольхах пад вокнамі. Швагер ахвотна згадзіўся. Чалавек ён быў працавіты, кампанейскі, да таго ж ён вельмі любіў усё жывое. Каля шпакоўняў адразу ўсчалася неапісальная калатня паміж бескватэрным птаствам. Давялося майстраваць яшчэ дзве шпакоўні. Павесілі іх на маладзенькіх рабінках, што раслі ў самым канцы агарода, непадалёк ад сукаватага вяза.

— Буслянку б тут змайстраваць, — прапанаваў Аляксей, разглядваючы з зямлі магутную крону вячыстага дрэва. — Хай бы жылі буслы паблізу. З імі неяк весялей.

— А што! — весела падахвоціў швагер. — Давай зробім! Толькі вось загвоздка: дзе возьмем барану?

— Такой бяды! За Кувелевай кузняй валяецца розная старызна. Ёсць там і бароны.

Буслянку ладкаваў Аляксей. Было гэта ў нядзелю. Пагода стаяла цёплая, бязветраная. Прыемна было босымі нагамі, як некалі ў маленстве, ашчаперыць камель дрэва, спрытна ўскараскацца пад самую вершаліну, падрэзаць таўшчэзнае сучча пілкай-аднаручкай, зрынуць яго долу і на выступках-падрубах трывала замацаваць барану.Сястра і швагер стаялі пад вязам і наперабой падказвалі знізу, дзе бяспечней паставіць нагу, якога нядошлага сучка трэба асцерагацца.

З Эльжбецінага ганачка за Аляксеем пільна цікавалі суседкі-кватаранткі, вачэй не спускалі. Неўзабаве да іх спаважна выйшла і сама Казіміраўна. Паглядзела з-пад рукі на вяз, на ўзрушана-усмешлівага Аляксея і сказала, як адсекла:

— Усё. Прапаў чалавек. Ажэніцца. І скора.

Дзяўчаты хацелі было запярэчыць, але старая рашуча замахала рукамі:

— Памянеце маё слова. Скора, вельмі скора.

І ўсё ж Эльжбета Казіміраўна памылілася. Вяселле, праўда, было, але далекавата адсюль. Не на іхнім падворку. Барыс Кірэйка з паўгода недарма настой-

ліва заляцаўся да Ядвігі, праходу не даваў. Знайшоў, выходзіць, ключык да сэрца маладой удавы: згадзілася Ядзя выйсці замуж за "самага адказнага паставога". Але ж умоў наставіла "што колля ў плоце", як сказаў Сашка, дашчэнту расчараваны "бесхрыбетнасцю" Барыса. Самай нечаканай умовай было патрабаванне Ядвігі абавязкова вянчацца ў царкве. Сашка, Віцька Захарчэня і Сярожа Клімашэўскі наадрэз адмовіліся ехаць у Рэвічы, дзе была бліжэйшая царква, хаця ўважылі просьбу неразлучнага сябра — паабяцалі абавязкова прыйсці на яго вясельны вечар. Вечар меўся быць у новай двухпакаёвай кватэры, выдзеленай Барысу спецыяльна з нагоды яго жаніцьбы ў доме чыгуначнікаў. Дом той стаяў непадалёк ад "кірхі" адстаўніка-маёра, дзе дагэтуль жыла Ядвіга.

Спачатку Аляксей таксама спрабаваў адгаварыць Барыса, нават сароміў яго: "А-я-яй! Малады мужчына, у камсамоле быў. Навошта табе тая царква здалася?" Нічога не выйшла. "Ядзя патрабуе, — ледзьве не плакаў Кірэйка. — Не магу не паслухаць, слова даў. Хоць ты, Фаміч, зразумей мяне". Угаворы не дапамагалі, тады і Аляксей адмовіўся: "Не прыйду я. І не прасі... Экзамены на носе. Ночы напралёт сяджу над падручнікамі".

Вяселле, як і належыць, імчала па вуліцы на трох парах коней — "бог троіцу любіць" — з вясёлай музыкай, песнямі, гучнымі выкрыкамі падпітых родзічаў маладажонаў. Першая пара сівых рысакоў была запрэжана ў чатырохместны фаэтон з адкінутым верхам і на рэсорах. Зроблены ён быў, пэўна, яшчэ за польскім часам; на ім ехалі маладыя і шаферы — Галя з Ігарам, стрыечным братам Барыса. Астатнія дзве пары коней неслі за сабой лёгенькія, але ўмяшчальныя брычкі з "дружкамі", музыкамі і сватамі.

Хто, будучы побач, зможа ўтрымацца і не кінуць позірк на маладых у дзень іх вяселля? Ці знойдуцца такія? Відаць, не. Хіба што сляпыя. Заўтра маладыя будуць такімі ж, як усе мы, звычайнымі людзьмі. Заўтра яны не стануць прэтэндаваць на ўвагу. А сёння? Сёння не забудзьцеся прывеціць іх. Хоць бы поглядам. Адным толькі поглядам. Прахожыя разумеюць гэта, спыняюцца, пазіраючы ўслед вяселлю.

І тыя, каторыя ўсё ведаюць, шкадуюць: не ў той бок паехалі, паслухаліся, каханенькія, цёмнага чалавека.

Якая жуда — узяць за павадыра святога.

Калі фаэтон праязджаў міма канторы сельпо, Аляксей нахлашч расчыніў акно кабінета, зірнуў на запоўненую людзьмі вуліцу. Галіна, убачыўшы яго, аж прыўзнялася на спружыністым сядзенні, хацела, напэўна, паказацца вясёлай. Не атрымалася — вочы здрадзілі. "Даруй! — крычалі яны. — Сястра яна мне. Першы шлюб брала без вянца, і шчасце было кароткім — разбіўся муж. Можа, на гэты раз ёй будзе ўдача. Даруй! Прашу цябе". Аляксей глядзеў паверх фаэтона, удалячынь, і Галіна, зразумеўшы гэта, пакрыўджана адвярнулася.

Вяселле ўжо схавалася за павароткай на рэвіцкую вуліцу, а ён усё яшчэ глядзеў у адзін і той жа бок, пакуль не адчуў на сабе нечы позірк. Бывае ж так: нешта як бы замінае табе, невядома дзе муляе, не па сабе робіцца. Схамянешся і пабачыш: цікуюць за табою нечыя вочы. Так яно і было: з натоўпу, што гаманіў пад акном канторы, за ім пільна сачыла Люда. Іх позіркі сустрэліся, і яна палахліва апусціла вочы. Потым падхваціла пад руку Надзею Паўлаўну, і абедзьве нетаропка падаліся ў бок сталоўкі — якраз набліжаўся час абеду.

А вясельны пераліў званочкаў нёсся ўжо над рэвіцкім бальшаком. Ядвіга адразу ўбачыла змену ў настроі шаферкі, спытала:

— Галка, што з табой? Збялела ўся, як палатно.

— Блага мне, — прызналася Галка.

— Гэты дурацкі драндулет каго хочаш закалыша, — скоса паглядзела нявеста на жаніха. — Не мог што-небудзь лепшае дастаць.

Галіна заступілася за Барыса.

— Драндулет тут ні пры чым. Проста мне блага. Я, пэўна, не пайду ў царкву, а то яшчэ павалюся там.

— Добра-добра, — спачувальна супакойвала Ядзя. — Хто-небудзь іншы патрымае вянец.

Галіна сапраўды не пайшла ў царкву. Нейкі час адна сядзела ў фаэтоне, пазіраючы, як услед за маладымі за царкоўную браму пацягнуліся цікаўныя — усё больш жанчыны шаноўнага ўзросту. Ма-

ладзейшыя рэвічане стаялі наўзбоч, пад густымі клёнамі, праз маладую лістоту якіх амаль што не прабівалася сонца. Да слыху Галіны далятaлі абрыўкі жартаў,нават кепікі ў адрас маладых — "Цемната!", "З глузду з'ехалі!" і яна зноў пашкадавала, што прыехала сюды. Малады голас пад клёнамі аксаміцістым баском раіў некаму "кульнуць сваё вока на тую каламажку". Стала ціха. Галіна здагадалася, што гавораць пра яе, адчула сябе няёмка, пачырванела. Басок зноў заявіў сябе: "Глянь, Люба, якая краля на сядзенні. Як з боскай рамачкі выскачыла... Жывая і цалюсенькая". Грымнуў смех. Але не надоўга. Яго спыніў вясёлы, трошкі задзірысты голас: "Хопіць вам, зубаскалы!.. Ой! Дык гэта ж мая саперніца".

Здранцвелая Галіна не паспела апамятацца, як ёй ужо ўсміхаліся поўныя, быццам прыпухлыя зверху, губы.

— Цябе Галка завуць?

— Галка. А што?

— Так, нічога... Я — Люба. Тая самая рэвіцкая Любка, што ў твайго Аляксея Фаміча на шыі вісела.

Галіна ўспыхнула, як макаў цвет.

— Ды ты не саромейся мяне, — ужо больш паблажліва сказала Люба. — Я даўно хацела ўгледзець цябе. Не выпадала неяк. Скажы: ты паверыла таму, што пра нас брэшуць?

Галіна маўчала.

— Дык вось, паслухай мяне, — Люба пакратала абцасікам свайго туфліка падножку фаэтона, уздыхнула. — Плёткі ўсё гэта. Нічога ў нас не было. На жаль, канечне... А табе я зайздрошчу. Па-жаночаму зайздрошчу. Гэта ж такое шчасце прываліла! Я б за ім на край свету пайшла. У агонь бы кінулася...

Люба нечакана павярнулася крута і пайшла. Адна. На гаманкіх вяскоўцаў пад клёнамі нават не зірнула. Галіна глядзела на яе зграбную постаць, модную прычоску і думала: "Такая прыгожая і няшчасная... Зрэшты, чаму няшчасная? Ядзя вунь другі раз выходзіць замуж. Можа, і ёй пашчасціць. Маладая яшчэ, прыгожая".

У той дзень зноў была цёплая і сонечная раніца. Яшчэ ў хлеўчыках спрасонку адчайна білі крыламі

гарластыя пеўні, за фіранкай ціха-мірна спала Эльжбета Казіміраўна — дзяўчаты былі ў начной змене, а Галіна ўжо прачнулася і цяпер баялася толькі аднаго: каб не заснуць зноў. Сёння ў яе цяжкі і адначасова радасны дзень. Ядзя пасля вяселля перабралася жыць да Барыса, у дом чыгуначнікаў, а свой пакойчык, аплачаны гаспадару за ўвесь год наперад, перадала ёй. Канечне ж, там ёй будзе лепей. Пасумуе ўпачатку без Казіміраўны, без дзяўчат-сяброўак, але ж нічога, сцерпіцца. "Трэба прыставаць да нейкага берагу", — вырашыла яна і цяпер рыхтавалася першай зрабіць яшчэ адзін крок да таго самага "берагу".

Увогуле-такі гэты крок яна збіралася зрабіць яшчэ ўчора ўвечары. Не атрымалася. Праваронила, калі Аляксей вяртаўся з работы. У пакойчыку, дзе ён звычайна нешта пісаў за маленькім столікам, гарэла святло, і Галіна з двара ўбачыла, што ён ужо дома, зноў сядзіць за падручнікамі. Угледзела яго — і сэрца сцялася. Пры святле настольнай лямпы Аляксей здаўся ёй не проста чужым і далёкім — недасягальным. Яна спалохалася гэтай недасягальнасці і бегма кінулася на свой ганачак.

Цяпер жа, што б там ні было, яна спадзявалася на сустрэчу, ад якой залежала калі не ўсё, дык ва ўсякім разе многае. Так думала яна, Галіна. І яна чакала яго.

У расчыненае акно быў добра бачны ўвесь панадворак, дзе Аляксей звычайна праходзіў да веснічак, адпраўляючыся на работу. Адсюль яна не раз і не два, тайком ад Казіміраўны і дзяўчат, цікавала за ім; тут, каля гэтага акна, яна апошнім часам глушыла ў сабе сарамяжлівыя дзявочыя ўздыхі па ім, па Аляксею, калі той праходзіў міма, нават не зірнуўшы на яе акно.

Чамадан і невялікі клунак даўно былі сабраны, заставалася адно ўзяць іх у рукі і ісці. Але Галіна не спяшалася. Яна чакала. Яна верыла, што ўсё будзе так, як задумала.

Дакладна гэтак усё і атрымалася. Аляксей падыходзіў ужо да веснічак, калі Галіна паклікала яго.

— Алёша! Памажы мне, калі ласка. Пераходжу на другую кватэру. Буду цяпер жыць у тым доме, дзе наша Ядзя раней жыла. Разумееш: нязручна адной

з чамаданам і клункам. Памажы, калі можаш. Табе амаль што па дарозе.

— Што за гаворка, — развёў Аляксей рукамі, падыходзячы да расчыненага акна. — Я з вялікім задавальненнем. Давай свае рэчы.

— Няўжо з задавальненнем? — насцярожылася Галіна, падаючы цераз акно спачатку чамадан, а затым і клунак. — Гэта я настолькі надакучыла, што ты з вялікім задавальненнем гатовы выправадзіць мяне хоць на край свету?

— Як сказаць, — спахмурнеў Аляксей. — Паспрабуй тут разабрацца, хто каму надакучыў. Не я ж ад цябе ўцякаю.

У акне побач з Галінай з'явіўся спалоханы твар Эльжбеты Казіміраўны.

— Што ты нарабіла! — закрычала старая. — Хто гэта, ад'язджаючы, нажытае цераз акно выстаўляе? К няшчасцю гэта. Памянеце маё слова. Давай, Алёша, назад яе набытак.

Аляксей пырснуў ад смеху:

— Кіньце вы, Казіміраўна...

Узяў чамадан і клунак, выйшаў на вуліцу.

Галіна дагнала яго, пайшла поруч, размахваючы невялічкім рыдыкюлем.

— Давай памагу, — працягнула руку да клунка.

— Не трэба. Набытак твой упаўне сучасны — лёгенькі.

— У цябе цяжэй?

— У мяне? — здзівіўся Аляксей. — У прымы не возьмуць: гол як сакол. Аднак мяне гэта не вельмі турбуе...

— Чаму? — Галіна паспрабавала зазірнуць яму ў вочы — ці не жартуе?

— "Назначен срок всему, — нараспеў, як гэта робяць паэты, па-руску прадэкламаваў Аляксей. — Здоровью — срок, удаче — срок, богатству и уму". Ёсць у Твардоўскага такія радкі. Чула?

— Не, — прызналася Галіна.

— Тады паслухай. Па-мойму, іх карысна ведаць.

Аляксей чытаў вершы і радаваўся, што яны падабаюцца Галіне.

Бывало, скажет в рифму дед,
Руками разведя:
— Как в двадцать лет

Силенки нет, —
Не будет, и не жди.
— Как в тридцать лет
Рассудка нет, —
Не будет, так ходи.
— Как в сорок лет
Зажитка нет, —
Так дальше не гляди...

— А нам з табой, — заключыў Аляксей, — яшчэ далекавата і да трыццаці, і тым больш да сарака. Так што турбавацца няма чаго.

Нейкі час яны ішлі моўчкі. На вуліцы трапляліся знаёмыя, здароўкаліся, усміхаліся ім абодвум. Нечакана для сябе Аляксей падумаў: "А што калі зараз стрэнецца Сашка?" Спытаў аб гэтым Галіну.

—Хм-м, а што мне Сашка, — абыякава хмыкнула яна. — Нічога ў нас з ім не было. І нічога няма.

Няцяжка было здагадацца, што Галіна не хоча гаварыць пра Сашку. Тым больш, гэта не ўваходзіла ў яе планы.

— Пачакай, — спынілася яна. — Дай я табе каўнер у гімнасцёрцы расшпілю. Душнавата сёння, дождж, напэўна, будзе.

Аляксей паслухаўся. Яна блізка падышла да яго, прыемна казытнула кудзерам шчаку. Расшпіліла каўнер. Далей, аж да самай "кірхі" адстаўніка-маёра, яны ішлі моўчкі. Пакойчык быў цеснаваты, з адным акном, але ўтульны. Стол, камода нейкага дапатопнага вырабу, аднаспальны ложак і прама насупраць яго — небагатае трумо. Вось і ўсё абсталяванне. Крэслаў не было аніводнага, і таму пакойчык здаваўся напалову пустым.

— Прысаджвайся, — паказала Галіна на ложак.— Гэта ўсё падаравала мне Ядзя. Зрабіла такі высакародны жэст. У іх з Барысам сваёй мэблі цяпер хоць адбаўляй, ставіць няма куды. Сёе-тое і мне перапала.

Яна гарэзліва падбегла да ложка, плюхнулася на спружыністы матрац і пачала, як дзіця, седзячы, падскакваць. Толькі тады Аляксей зразумеў, што трумо пастаўлена насупраць ложка не выпадкова. Падумаў: "Відаць, Ядзя любавалася сабой у пасцелі".

— Што ж, дарагая гаспадынька, дазволь адвітацца, — Аляксей падышоў да ложка, каб развітацца.— Яшчэ раз віншую з наваселлем. Здароўя! Шчасця! Ад душы.

Яна не знайшла што адказаць яму і як затрымаць яго. Разгубілася — рушыўся яе план. Нейкім не сваім ад хвалявання голасам спыніла яго ўжо каля парога:

— Пастой, Алёша!.. Скажы мне... Толькі не крыўдуй... Ты з усімі такі нясмелы ці толькі са мной?

Іх позіркі сустрэліся. І зноў гэтыя вочы: "Чаму ты такі?.. Пабудзь са мной... Прашу цябе..."

Не сказаць, каб Аляксей западозрыў нешта ці здагадаўся пра Галіны хітрыкі — не; ён адчуў сябе як бы трошкі прысаромленым, ад чаго змушаны быў застацца мужчынам.

— Хто табе сказаў, што я нясмелы? — рашуча, з выклікам адышоў ад парога.

Лёгка за плечы Аляксей узняў яе з ложка, прытуліў да грудзей. Галіна не супраціўлялася. Наадварот, яна ахвотна падставіла свае вусны і задрыжала, задыхнулася ў гарачым пацалунку. Пазней, захінаючы твар рукамі, сарамліва дапытвалася:

— Што ты цяпер падумаеш пра мяне? Сама, можна сказаць , на шыю кінулася. Які сорам!..

Ён не стаў супакойваць яе. І не таму, што не ўмеў гэтага рабіць. Упершыню Аляксей убачыў, адчуў і зразумеў усю прывабнасць дзявочай сарамлівасці, быў да крайнасці ўражаны ёй. Гэтая сарамлівасць на нейкае імгненне засланіла сабой усё, паланіла яго цалкам, без рэшты. "Дзявочая сарамлівасць — гэта цудоўна", — прамільгнула ў галаве. Сапраўды, гэта не вабныя ямачкі на шчоках з натуральным румянцам, не гнуткі стан, не лебядзіная шыя, не блакітныя, як васількі ў жыце, даверліва-мілыя вочы. Гэта непамерна большае, перад чым бездапаможна блякне святло вонкавай красы, любое, уласцівае жывым істотам, хараство. Аляксей здзівіўся свайму адкрыццю: "Самае прывабнае ў дзяўчыны — не сарамлівасць". І ён зноў і зноў, як толькі ўмеў, як толькі мог, мілаваў гэту сарамлівасць — палка цалаваў вочы, вусны, шыю.

У сенцах пачуліся нечыя хапатлівыя крокі. Галіна, як знала ўсё адно, адхіснулася ўбок. Дзверы прачыніліся — на парозе стаяў Сашка.

— А-а, здравія жалаю! — няўмела казырнуў ён. — А мне кажуць, наўючыла Аляксея, ледзьве ногі павалок. Дай, думаю, памагу...

— Не патрэбна ўжо твая дапамога, — у голасе Галіны прагучала непрыкрытае раздражненне.

— У адным не патрэбна, дык у другім, можа, спатрэбіцца, — не здаваўся Сашка, з яўным намёкам пстрыкаючы пальцамі правай рукі. — Замочка будзе? Кажуць, самы вялікі грэх, калі навасёлы не адзначаюць наваселле. Так што я да вашых паслуг, сеньёры. Магу збегаць, — ён зноў пстрыкнуў пальцамі. — Мігам.

— Не варта, — запярэчыў Аляксей. — Я не магу спазняцца, сёння ў мяне прыёмны дзень.

— Дзівак-чалавек, — развязна пакруціў галавой Сашка. — Начальства не спазняецца — яно затрымліваецца.

— Усё роўна не магу. Я, мабыць, пайду. Усяго табе добрага, Галя.

— Пачакай мяне на вуліцы, — кінула наўздагон Галіна. — Я зараз.

Аляксей так і не дачакаўся Галіну. Каля плота, дзе ён хвілін колькі нехаця курыў, гулялі дзеці, хлопчык і дзяўчынка. Папяроса ўвесь час гасла, і Аляксей толькі тое і рабіў, што прыкурваў яе. Дзеці гулялі "ў дарослых". Дзяўчынка, хаця і была меншай і ростам, і, пэўна ж, маладзейшай гадамі, увесь час вяршэнствавала ў гульні. То яна першай пераскаквала канаўку, то прыносіла з кювета пад плот бялявы пясок-плывун — "муку на зацірку". Нарэшце, хлопчык не стрываў — заплакаў. Дзяўчынка працягнула яму цукерку-"падушачку". Але ён (усё ж мужчынскае саслоўе) адвярнуўся і пайшоў прэч. Тады ўжо зарумзала дзяўчынка.

Гэта крышку развесяліла Аляксея. І ўсё ж на чарговы прыём наведвальнікаў ён ішоў з цяжкім, як валун, сэрцам. У галаву лезлі самыя неверагодныя думкі, адна страшней за другую. Вінаваціў, канечне, Галіну, і несправядліва вінаваціў.

Як толькі Аляксей зачыніў за сабой дзверы, Сашка паспяшыў падпёрці плечуком вушак і прастагнаў, сярдзіта і грозна:

— Не пушчу! Хоць забі, не пушчу!..

Галіна бездапаможна аблакацілася на камоду і заплакала, па-дзіцячы роспачна і гучна.

Зямля прагла дажджу.

Пачатак лета выдаўся сухім, бязветраным. За месяц ні ў Мілавічах, ні ў навакольных вёсках не бачылі нават хмурынкі на небе. Адны дзеці радаваліся сонцу. Загарэлыя, як цыганяты, яны цэлымі днямі або не вылазілі з абмялелай Цны, або гойсалі па лесе, па перасохлых прыбалатках у пошуках чарніц-заморкаў. Расплываўся, шырыўся трывожны слых пра непазбежнасць жорсткай засухі. І толькі людзі ў гадах не пераставалі прадвяшчаць: дажджлівае будзе лета, гнілое. Ім ніхто ужо не верыў, асабліва бязвусыя маладзёны, але і не пярэчыў адкрыта. Спытаеце: чаму? Старасць і мудрасць, як вядома, хаця і не на адным канцы лаўкі сядзяць, але ж адна да другой бліжэй, чым маладосць з прадбачлівасцю. Дзе тут пярэчыць! Яно, відаць, справядліва: "Маладосць, матай на вус — на старасць будзе добры кус".

Між іншым, праліўныя дажджы пару дзён ужо шасталі над Гарынню, Пінай, Ясельдай. І толькі міжрэчча Лані і Цны чакала сваёй чаргі.

І — дачакалася.

Адвячоркам, было гэта ў нядзелю, сонца паволі села над лесам у бялюткую хмарку. Адразу спала гарачыня, і сотні людзей высыпалі на вуліцы. Маладзейшыя кіраваліся ў бок танцпляцоўкі, збудаванай прадвеснем у лесапарку за "кірхай" адстаўнікамаёра (сёння якраз чакалася яе афіцыйнае адкрыццё), старэйшыя збіраліся каля сваіх хат, магазінаў, балакалі пра жыццё-быццё або, як гаварыў Сашка, "пералівалі з пустога ў парожняе".

А дзе Аляксей? Дзе Галіна?

У Аляксея сёння асабліва адказны дзень — апошні экзамен на атэстат сталасці. Экзамен па нямецкай мове. Як бы там ні было, а гэты экзамен ён здасць. У што б там ні стала. Ёсць упэўненасць — лічы, справа зроблена. Праўда, з большага ён ведае толькі нямецкую мову, ды і тую з венскім дыялектам, але ж гэта такая палёгка, якой не мае ніводзін з паўсотні сённяшніх выпускнікоў школы працоўнай моладзі. Аляксею дыхнуць няма калі: пытанні і просьбы, пытанні і просьбы.

— Ты ідзі здаваць апошнім, — просяць яго.

— Чаму?

— Пасля цябе нам рабіць там няма чаго.

У другім канцы калідора здаюць экзамен па рускай літаратуры маракі гандлёвага флоту. Яны спазніліся — трапілі ў шторм, ці што, але ім у парадку выключэння дазволілі здачу. Хвалююцца хлопцы да смешнага. Адзін з іх, сноўдаючыся па калідоры, пытае ў Аляксея:

— Скажыце, вы часам не памятаеце, як звалі бацьку Веры Паўлаўны?

— Як жа, памятаю. Іванам звалі.

— Ага, дзякуй... Бацьку Веры Паўлаўны звалі Іванам... Пачакайце. Што ж атрымліваецца? Цьфу ты... Палундра, братва. Мазгі набакір!

Падступаюць дзяўчаты.

— Алёша, ты ў Вене служыў?

— Так, у Вене.

— Значыць, венскую музыку ведаеш. А што табе больш за ўсё падабаецца?

— "Развітанне славянкі".

— Дык гэта ж рускі марш!

— Наш палкавы аркестр, апрача Гімна ды гэтага марша, нічога не іграў. Не ведаю чаму, але сёння, як толькі пачую знаёмую мелодыю, чэснае слова, плакаць хочацца. Так за душу бярэ...

"Наступаюць" нядаўнія салдаты ў такіх жа, як у Аляксея, палінялых гімнасцёрках, адхінаюць дзяўчат.

— Адчапіцеся вы, музыканты! Знайшлі час... Дайце жыццёва важнае пытанне вырашыць. Слухай, айцец Алексій. Здаць мы, канечне, здадзім. Пазвані, калі ласка, у сваю парафію, каб чайную рана не зачынялі.

— Навошта?

— Дамскае пытанне на жаночым сходзе. Апошні экзамен — гэта ж падзея! І для саміх і для жонак. Яны ж нас там, унізе, чакаюць.

Каля груваcткай тэлефоннай скрынкі, прыбітай на сцяне, Аляксей спыніўся, зірнуў у акно. Удалечыні над лесам раз-пораз успыхвалі зарніцы далёкай навальніцы. Адсюль, з другога паверха, ужо цяжка было разгледзець прылягаючыя да школы вуліцы, паяскі тапалёвых прысад — усё захінаў густы вечаровы морак. Усё ж, калі б Аляксей быў больш уважлівым, мог бы яшчэ ўгледзець адзінокую постаць, што цямнела пад купчастай таполяй непадалёк ад школы.

Гэта была Галіна. Пасля таго няўдалага наваселля Аляксей пачаў пазбягаць яе. І яна вырашыла зрабіць яшчэ адзін крок насустрач іх "агульнаму ўзаемаразуменню", як вучыла Ядзя. Больш падыходзячага выпадку (апошні экзамен) і месца (непадалёк ад школы) нічога прыдумаць не змагла. "Будзь што будзе!" — павучала Ядзя, адпраўляючы сястру на спатканне.

Праўда, на гэты раз Галіне не шчасціла з самага пачатку. Каля вакзала да яе прычапіўся нейкі прыезджы матрос, потым трапляліся знаёмыя, і трэба было перад кожным апраўдвацца — каго чакае, што шукае? А цяпер вось пачаў накрапваць дождж, і Галіна змушана была пайсці. Дождж спарнеў. Паспрабавала бегчы — не атрымліваецца: замінаюць высокія абцасікі туфляў. Зняла туфлі, пабегла басанож. На рагу цэнтральнай вуліцы пад шырокую паветку латочніц хаваліся ад дажджу запозненыя прахожыя. Шмыганула туды і Галіна. Ускочыла пад паветку — і трапіла ў абдымкі Сашкі.

— Гм-м, — пакруціў Сашка галавой, — каго ты тут шукаеш у дождж?

— Цябе, — кінула сярдзіта цераз плячо, вызваляючыся з абдымкаў.

Памаўчалі. Неўзабаве Сашка зашаптаў каля вуха:

— Слухай, Галка. Хадзем да нас. Дзядзька ў гасцях, дома нікога няма. Перачакаеш дождж, а потым праводжу цябе дамоў.

Яна яшчэ не ўцяміла сэнсу яго слоў, а Сашка ўжо выштурхнуў яе з-пад паветкі і за руку пацягнуў цераз вуліцу да высокага асабняка.

Пакой Сашкі быў удвая большы за Галінін, багацей абстаўлены. Але гэта быў халасцяцкі пакой. На крэслах валяліся сарочкі, на памятым ложку ляжалі нейкія выразкі з ілюстраваных часопісаў, пачак папяросы. Уражвала вялізная шафа з кнігамі. Туды, верагодней за ўсё, не даходзілі рукі Сашкі, і кнігі стаялі ў строгім парадку. На падлозе ляжаў недарагі, але даволі прыгожы дыван. Галіна прыкмеціла яго, яшчэ калі ставіла ў парозе свае туфлі.

— На, вытрыся, — працягнуў Сашка ручнік і памкнуўся дапамагаць ёй.

— Я сама, — адвяла яна яго руку.

Сашка пакрыўдзіўся.

— Ну што ты, як маленькая. Мы ж не дзеці.

Пры гэтых словах ён моцна абняў яе і пачаў цалаваць. Галіна спрабавала вырвацца, але Сашка абхапіў яе, як абцугамі. Спалохалася яна пазней — калі адчула, што падае на ложак, закрычала:

— Адпусці мяне! Зараз жа! Чуеш?.. Што ты робіш, вар'ят?..

Ён цяжка дыхаў, нязвязна паўтараючы адно і тое: "Мы ж не дзеці... Мы ж не дзеці... Вушы не адарві..." Вушы! Ядзя не раз павучала, як бараніцца ад нахабнікаў: "Цісні кіпцюрамі за мочкамі вушэй — ніхто не вытрывае". І сапраўды, як толькі яна з усёй сілы ўпілася пазногцямі ў шыю за мочкамі вушэй, Сашка войкнуў і зваліўся з ложка на падлогу. Яна перескочыла цераз яго і кінулася за дзверы.

— Туфлі забяры, —дурніца! — крычаў ён услед. Але Галіна ўжо не чула гэты слоў.

На вуліцы лупцаваў такі дождж, што і разадраная на грудзях сукенка і ўся астатняя, няхітрая ўлетку дзявочая апратка, адразу ж прыліпла да цела. Крыўда і злосць на Сашку перапаўнялі сэрца. Хацелася плакаць, але слёз не было. Была толькі злосць—тупая, халодная, як лязо калуна.

Над галавой двойчы запар трэснуў пярун, і маланка асвяціла руіны. Галіна звярнула на дворышча Абажанка, каб адсюль напрасткі бегчы да сваёй "кірхі". Як толькі яна параўнялася з абгарэлым чалом Абажанкавай печы, зыркая пісага маланкі скацілася на бярозу, і тут жа аглушальна грукнуў пярун. Галіна ўпала, ашчаперыўшы твар рукамі, на момант аглушаная ад грымот. Яна не бачыла, як падала бяроза, зрынуўшы сваім цяжарам чало печы, як камлыга сцэментаванай цэглы ледзь не патрапіла ёй па галаве. Калі, ачнуўшыся, Галіна нарэшце расплюшчыла вочы, пры святле маланак угледзела перад сабой ёмісты збан. Ён ляжаў побач з расколатай напалам камлыгай і быў завязаны зверху бліскучай цыратай. У адным месцы цырата была разадрана, і са збана высыпалася некалькі блішчастых, як ёй падалося, гузікаў. Галіна не адразу зразумела, што гэта было золата. Паспрабавала ўзяць збан — і атарапела: ён быў такім важкім, што з цяжкасцю паставіла яго перад сабой..."Золата!.." Халодныя дрыжыкі прабеглі па ўсяму целу. Але Галіна хутка

авалодала сабой, пастаралася супакоіцца, стала збіраць рассыпаныя манеты. Потым захінула збан прыполам сваёй сукенкі і панесла дамоў.

Да самай раніцы яна не звяла вачэй. Прымярала зіхоткія завушніцы, бранзалеты, спрабавала лічыць маленькія, з пазногаць, бліскучыя манеты. Пры цьмяным святле газоўкі яны здаваліся чырвонымі, як кроў. За акном, шчыльна завешаным коўдрай, па-ранейшаму лютавала навальніца, ліў, не сціхаючы, дождж. Калі б хто-небудзь збоку мог у гэты час паназіраць за Галінай, не пазнаў бы яе. Растрапаныя, усё яшчэ вільготныя валасы захіналі твар, рукі ледзь прыкметна дрыжалі. Яна сядзела на ложку, падкурчыўшы пад сябе ногі. Перад ёй на саматканым пакрывале ляжаў такі скарб, пра які ёй не даводзілася чуць нават у казках. Пярсцёнкі з рознакаляровымі каменьчыкамі былі велікаватыя для Галіны, падалі з яе тонкіх пальцаў. Яна нанізвала іх па два, па тры на палец, але пярсцёнкі ўсё роўна падалі. І гэта пачало яе злаваць. Знячэўку яна ўгледзела сябе ў трумо і спалохалася: падалося, што ў пакоі яна не адна. Тут жа скочыла на падлогу, выцягнула з-пад ложка чамадан і ссыпала туды ўвесь скарб. Чамадан спрабавала схаваць пад падушку, але з гэтага нічога не атрымалася — тырчалі акутыя алюмініем вуглы. Сунула чамадан пад ложак, сама стулілася да падушкі.

Упершыню ёй стала сцішна ў гэтым пакоі. З недаверам паглядзела на ўнушальную зашчапку на дзвярах, палегчана ўздыхнула — крук надзейны.

І не было тут каму падаць ёй руку, каб утрымаць ад падзення ў жахлівую прорву, над якой яна бяздумна схілілася ўсёй сваёй істотай.

Дождж не сунімаўся двое сутак, ліў без перапынку, як з вядра. Аціх ён толькі на трэці дзень, у сераду. Ранкам з-за нізкіх попельна-шэрых воблакаў спакваля выглянула сонца, і тады многія гараджане ўбачылі, што іхнія паселішчы напалову заліты вадой. Вада стаяла скрозь — на дарогах, у агародах, затапіла па-старасвецку зрубленыя хлявы і нават мураваныя скляпы. Цна выйшла з берагоў, і цяпер на яе вірлівым стрыжні плылі цэлыя пракосы сена са скошаных надоечы надрэчных паплавоў.

Пярун таксама нарабіў глуму ў горадзе. На вуліцах валяліся паколатыя ў камлях дрэвы-перастаркі, на ацалелых пасмах тэлефонных і тэлеграфных дратоў матляліся дашчэнту пасечаныя слупы. Больш за ўсё затрымліваліся прахожыя каля пажарнай. Маланка патрапіла якраз у новую каланчу, не паспелі паставіць грамаадвод, і тая рассыпалася на трэскі, як струхлелая шпакоўня, зрынутая ветрам са стромкай вышыні. Да пажару, на шчасце, не дайшло, але пажарнікі, як жартавалі ў Мілавічах, упершыню не спалі ўсю ноч напралёт.

Адно Кувель быў раўнадушны да ўсяго. Панурыўшы галаву, ён доўга не адводзіў вачэй ад акуратненькай ямкі ў расколатай камлызе цэглы на Абажанкавым двары.

— Што шукаеце, дзядзька Арон! — гукнуў яго Аляксей, праходзячы ўранку на работу.

— Учарашні дзень, — злосна буркнуў Кувель у бараду і патэпаў у бок сваёй кузні.

Настрой у Аляксея быў прыўзняты, радасны, і ён не спяшаўся ў кантору. Прычын для радасці было дзве: першая — у кішэні, як гаворыцца, пуцёўка ў жыццё — атэстат сталасці, і другая — сёння ён па намаганню сястры ўпершыню пасля дэмабілізацыі надзеў сваю абнову — даволі шыкоўны цёмна-сіні касцюм. Абнова заўсёды ўзнімае настрой. Праўда, касцюм быў не з лепшых тканін, усяго-наўсяго суконны, але выглядаў нішто сабе. За паўгода работы ў сельпо ўдалося сабраць трошкі грошай, якіх хапіла яшчэ і на ўпаўне элегантныя чаравікі, на белую ласцікавую сарочку і гальштук. "Не пазнаюць цябе сёння твае гандляры", — радавалася сястра, праводзячы Аляксея за парог, на работу. Гандлёвых работнікаў яна недалюблівала і ў асяроддзі блізкіх людзей называла іх не зусім пачціва — гандляры.

Яго і сапраўды не пазналі ў канторы. Усе прывыклі бачыць свайго старшыню ў гімнасцёрцы і ботах, і калі ён зайшоў у бухгалтэрыю, амаль ніхто не звярнуў на гэта ўвагі. Хіба мала людзей перавернецца тут за дзень! Толькі Люда ўспыхнула, як журавінка пад расталым снегам. Аляксей, як належнае, прыняў віншаванні (абновы на той час лічыліся падзеяй ключнай важнасці), падзякаваў "на добрым слове"

і пайшоў у свой кабінет. Надзея Паўлаўна,бухгалтар, тут жа шапнула Людзе:

— Што ты гарыш, хоць прыкурвай ад цябе...

За час экзаменаў работы сабралася столькі, што Аляксей не выходзіў з-за стала да самага вечара. Толькі ў абед збегаў перакусіць у сталоўку — хвілін на пятнаццаць, не болей, а ўвесь астатні час страчыў даўжэзныя справаздачы ўсім аддзелам спажыўсаюза — гандлёваму, планаваму, фінансаваму, аргмасавай работы, кадраў, нарыхтовак.Сумна падумаў: "Калі сказаць каму, што ў старшыні сельпо столькі пісаніны, — не паверацъ".

Ад гэтага занятку яго адарвала Надзя. Яна без стуку прыадчыніла дзверы і пазвала яго пальцам:

— Алёша, цябе можна на хвілінку?

— Заходзь, Надзя. Заходзь, калі ласка.

Надзя нясмела зайшла ў кабінет, спынілася ў дзвярах.

— Ой, Лёша! Які ты сёння файны! Чэснае слова, не пазнаць, сам на сябе не падобны.

— Ды ты праходзь, Надзя, сядай.

— Не буду садзіцца, некалі мне. У мяне да цябе дужа вялікі сакрэт. — Азірнулася па баках, зашаптала: — Галка прасіла, каб ты зараз жа прыйшоў да яе. Яна хварэе, сёння трэці дзень на работу не хадзіла.

— А што з ёй?

— Не ведаю. Трасе яе ўсю, лікаманіць.

Аляксей задумаўся.

— Паслухай, Надзя. Можа, лепей Сашку пакліч.

— Разумны ты хлопец, Алёша, а вось у сардэчных справах не кумекаеш анічога. Цябе яна кліча. І праз цябе хварэе.

— Праз мяне?

— Так... Яна ў нядзелю чакала цябе каля школы. Пад дождж патрапіла. Вымакла да ніткі. Прастудзілася, напэўна... Кахае яна цябе. Няўжо ты не бачыш гэта? Адным словам, я сказала, а ты рабі як знаеш...

І — выскачыла за дзверы.

Аляксей не вагаўся: пайсці ці не. Склаў у шуфлядку стала паперы, замкнуў кабінет і выйшаў на вуліцу. Сонца садзілася над лесам. Пасля праліўнога дажджу яно здавалася такім зыркім, што на яго цяжка было глядзець. Аляксей падумаў: "Трэба нешта купіць, няёмка ісці з пустымі рукамі". Зайшоў

у адзін з магазінаў. Гастраномаў на той час у раённых цэнтрах не было, і ў магазінах харчовых тавараў гандлявалі ў асноўным запалкамі, папяросамі, рыбнымі кансервамі ды таннымі цукеркамі. Купіў кілаграм "падушачак" і пашыбаваў у бок дома адстаўніка-маёра.

Галіна была адна. Яна ляжала ў пасцелі, па шыю загорнутая белай прасціной. У пакоі пахла духамі і валер'янкай. І яшчэ рутай-мятай, букет якой стаяў на стале. Твар у Галіны быў спалоханы, бледны. Спалох як бы застыў у яе вялікіх блакітных вачах. І толькі губы па-ранейшаму рдзелі, як макі. Угледзеўшы яе, Аляксей упершыню адчуў, як хваля пяшчоты захліснула грудзі, ад чаго сэрца здрыганулася і прыемна зашчымела. "Няўжо кахаю?" Яна даверліва ўсміхнулася, пасунулася бліжэй да сцяны. Паклала паўзверх прасціны голыя рукі, паказаўшы на край ложка.

— Дзякуй, што прыйшоў.

— Што з табою, Галя? Можа, доктара паклікаць?

— Не трэба доктара. Я ўжо здаровая. Ды сядай ты, не бойся... Вось так... Цяпер усё па парадку. Па-першае, я віншую цябе з атэстатам сталасці. — Летуценна ўздыхнула: — Атэстат сталасці — гэта зорны час маладосці, афіцыйны дазвол на ўсё жыццё. — Зноў уздыхнула. — Па-другое... Тут мне Ядзя прынесла газеты з тваімі артыкуламі. Ты дужа хораша пішаш, Алёша. Асабліва там, дзе прыроду апісваеш... Таксама віншую...

Ён толькі што хацеў падзякаваць, але Галя нечакана абвіла шыю Аляксея рукамі, прыцягнула да сябе і стала цалаваць яго твар. Моцна-моцна, як тады, у дзень наваселля. Кроў ударыла ў галаву Аляксея. Ён упершыню ў жыцці гэтак прагна і горача цалаваўся. А калі стомлена (і сарамліва адначасова) уткнуўся галавой у падушку акурат побач з рассыпанымі кудзерамі яе валасоў, Галіна прыўзнялася на локаць, паправіла шлейкі сарочкі з танюсенькага саматканага палатна і аддана прытулілася да ягонай галавы, як бы патрабуючы: "Ну,цалуй мяне, цалуй".

Лёгка кружылася галава, і Аляксей на нейкі час зажмурыў вочы. Густы водар руты-мяты перасядаў у горле. Стала цяжка дыхаць. Ён паволі ўзняў галаву з падушкі і, гледзячы ў бок, спытаў:

— Што будзем рабіць далей?

Яна маўчала. Прасціна спаўзла ледзь не да таліі, але Галіна нават не спрабавала нацягнуць яе. Аляксей убачыў у люстэрку яе смуглявае цела і падумаў: "Дзе ты паспела гэтак прыгожа загарэць?"

— Можна мне задаць табе адно недарэчнае пытанне? — чамусьці шэптам азвалася яна.

— Хоць два.

— Не, спачатку толькі адно... Што б ты рабіў, Алёша, каб знайшоў чамадан грошай? Тысяч сто... Нават больш...

Пытанне падалося сапраўды недарэчным, і Аляксей засмяяўся.

— Гм, што б рабіў? Аднёс бы ў міліцыю, і ўсё.

Ён не заўважыў спалоху ў вачах Галіны, адчуў толькі, як яна здрыганулася ўсім целам, цераз сілу выціснула з сябе:

— Няўжо аднёс бы?

— Канечне.Навошта мне чужое? Жыць трэба сваім мазалём. А жыць за чужы кошт — гэта ўсё роўна што цалавацца ў процівагазе. Ніякай асалоды.

І зноў гэты няўлоўны спалох. Каб не выдаць свайго хвалявання, Галіна захінула вочы рукамі, прашаптала са здзекам:

— Таксама сказаў: цалавацца ў процівагазе...

Яна пацягнула прасціну, спрабавала ўсміхнуцца, але ўсмешкі не атрымалася. Выйшла так, як звычайна ўсміхаюцца цяжкахворыя, калі не хочуць непакоіць сваім болем блізкіх людзей.

— Цяпер, Галя, мая чарга задаваць пытанні. Можна?

— Калі ласка.

Адно цяпер Аляксей успомніў пра кулёк з цукеркамі, які ляжаў на стале, падаў яго Галіне. Гаварыць стараўся спакойна, як гавораць мужчыны ў такіх выпадках.

— Ты падабаешся мне, Галя... Нам трэба сур'ёзна пагаварыць... І я хачу, каб ты дапамагла мне ў гэтым...

— Я-а? — здзівілася Галіна.

— Так, ты. Ты падабаешся мне. Можа, ты і ёсць той самы чалавек, які патрэбны мне ў жыцці... Справа ў тым, хто я хачу вучыцца...

— Вучыцца ніколі не позна, — няпэўна перабіла яна.

— І я гэтак думаў. А вось рэдактар нашай раённай газеты... Ты ведаеш яго?

— Ведаю. Вельмі талковы чалавек.

— Дык вось ён раіць мне паступаць вучыцца неадкладна. Ён кажа, што журналістыка — маё прызванне. А што датычыцца гандлю, дык там працаваць зможа кожны. Таму што кожны чалавек ад прыроды і пакупнік, і прадавец... Я лічу цябе, Галя, вельмі блізкім мне чалавекам. Што ты мне параіш?

— Я-а? — зноў здзівілася Галіна, прыўзняла галаву з падушкі. — У мяне нешта разбалелася галава. Давай мы заўтра пагаворым пра гэта. Я хачу сёння адпачыць. І... і падумаць.

— Хай сабе заўтра. Не гарыць. Дарэчы, ты чула ці не: на заўтра перанесена адкрыццё новай танцпляцоўкі. Так што я цябе запрашаю. Калі хочаш, зайду за табой пасля работы?

Яна згодна хітнула галавой. Аляксей хацеў было пацалаваць яе, але Галіна адхіснулася і спрытна сунула яму ў рот "падушачку".

— Да заўтра, — засмяялася яна. — Да заўтра.

Быццам захмялелы ад віна, выходзіў ён на вуліцу. Сутонела. Вечар быў ціхі і парны, як гэта здараецца ўлетку пасля навальнічнага дажджу. Дамоў ісці не хацелася, і Аляксей доўга блукаў у вечаровым мораку па вуліцах прыціхлага гарадка, многа і прагна курыў. У галаву лезла ўсялякая неразбярыха. Пра Галіну, пра самога сябе. "Ах, як нядобра атрымалася. Сорам нават успомніць. Давёў дзяўчыну да шаленства і... распусціў нюні: "Што будзем рабіць?"... Між іншым, пра якія гэта яна грошы гаварыла? Цэлы чамадан грошай? Навошта? Выпрабоўвала? Гэта ўсё Ядзіна "школа". Як бы там ні было, а зараз жа пайду да яе, і ўсё ўладжу. Хоць бы прабачэння папрашу".

Праз колькі часу ён ужо стаяў перад знаёмым домам. З вокан цяпер лілося зыркае святло. І толькі ў пакойчыку Галіны было цёмна.

"Спіць, — падумаў Аляксей. — Добра, заўтра пагаворым".

Аднак Галіна не спала. Аляксей і падумаць не мог, што тут адбылося, калі ён пайшоў. Спачатку, як толькі ён зачыніў за сабой дзверы, Галіна заплакала. На гэты раз ціха, нягучна. Потым выцерла прасціной звільжэлыя вочы, хацела падняцца з

пасцелі. Адчула, што галава напраўду баліць, зноў лягла, сцішылася. Не хацелася ні спаць, ні есці, ні думаць. Такога з ёй ніколі не здаралася раней. На душы было ціха і пуста, як у пахмурным вечаровым небе.

Сцішаныя, па-мужчынску нетаропкія крокі яна ўчула яшчэ на сцежцы, далекавата ад дому. А калі яны пачуліся пад акном, на рыпучых маснічынах крытага ганку, Галіна ўзрадавалася: "Алёша! Вярнуўся! Як хораша! Сёння ж скажу яму ўсю праўду. Адной мне несці такую ношу не па сіле..." Дзверы без стуку прыадчыніліся, і ў пакой нясмела зайшоў Сашка. Ужо было па-сапраўднаму змрочна, але Галіна адразу пазнала яго. На ўсякі выпадак падумала: "Калі што якое, буду крычаць".

— Туфлі прынёс, — ціха вымавіў Сашка і паклаў скрутак на крэсла, што стаяла ўпрытык да сцяны, непадалёк ад парога. — Ты даруй, Галіна. Сам не ведаю, як усё атрымалася. Трэці дзень месца сабе не магу знайсці. Даруй...

— Дурны ты, Сашка, — больш для прыліку, чым па душэўнай патрэбнасці, уздыхнула Галіна. — А я думала, ты чалавек.

— Чалавек я, Галка, чалавек. Кахаю цябе. Усё для цябе зраблю, што ні пажадаеш. Павер.

— Так я табе і паверыла, — зноў артыстычна ўздыхнула Галіна і нечакана для сябе самой спытала: — Скажы мне, Сашка, а што б ты рабіў, каб знайшоў чамадан грошай? Поўны чамадан.

— Я б табе, мілая мая, наладзіў такую жытку — павай хадзіла б, у золаце купалася.

— Няўжо прысвоіў бы чужыя грошы?

— Якія ж яны чужыя? Я ж не ўкраў.

Сашка асмялеў, наблізіўся да ложка, крануў рукой спацелы Галін лоб і жахнуўся:

— Ты што — захварэла? Гарыш уся! Гэта я, дурань, вінаваты. Даруй, прашу цябе, даруй, калі ласка.

Не сказаць, каб ён разлічваў на яе дараванне — ведаў круты нораў Галіны, але цяпер не мог не прыкмеціць нечаканыя і незразумелыя змены ў яе паводзінах. Яна маўкліва дазволіла, хаця ён і не прасіў дазволу, прысесці на край ложка, нікольки не супраціўлялася, калі ён пачаў абдымаць яе і цалаваць. Адно калі адчула яго зусім блізка, побач з

сабой, бяссільна спрабавала супраціўляцца: "Сашка, ты што... Не трэба... Не трэба... Дзверы хоць зашчапі", і не пярэчыла, калі пачула ў адказ: "Ніхто сюды не прыйдзе..."

Назаўтра быў мітуслівы дзень, зусім непадобны на ўсе астатнія дні тыдня. Непадобны ў тым сэнсе, што быў ён незвычайны, перш за ўсё, для саміх жа гандлёвых работнікаў. Чацвер — сярэдзіна гандлёвага тыдня, якраз той самы час, калі кожны крамнік мог беспамылкова вызначыць становішча спраў: спраўляецца з выкананнем планаў рознічнага тавараабароту, нарыхтовак, збору паявых узносаў ці не спраўляецца. Менавіта ў гэты дзень у сельпо з'язджаліся загадчыкі вясковых крам — каб "выбіць" паболей ходкага тавару, нарыхтоўшчыкі — каб "уварваць" лішнюю тысячу рублёў на закуп дзікарослых ягад, лекавай і тэхнічнай сыравіны. Лета ж — сезон усім сезонам, прамаргаеш яго — пішы прапала. Што ні гавары, а нарыхтоўка — работа заўжды сезонная, патрабуе дакладнага разліку. І таму Аляксей падоўгу гутарыў з нарыхтоўшчыкамі, раіўся, дзе лепей адкрыць прыёмныя пункты, яшчэ і яшчэ раз удакладняў, які сяголета ўраджай на маліну, брусніцы, ці ўрадзілі журавіны, што кажуць непаседлівыя грыбнікі — будуць грыбы ці не? — і калі лепш за ўсё вывозіць на грыбныя дзялянкі прадымленыя палаткі грыбаварняў.

Дзень праляцеў непрыкметна, у звычайных турботах. Клапотная гэта справа — гандаль, і асабліва сельскі гандаль. Толькі збоку здаецца: раскашуюць людзі з-за прылаўка, усяго ў іх навалам. Дзе там! Можа, цяпер трошкі лягчэй, а на той час звычайных цвікоў ці ваксы было ў абрэз. І не адмахнешся ад падначаленага, калі бачыш, што чалавек не для сябе просіць — людзям хоча дагадзіць, дзеля іх стараецца. Застаўся Аляксей без абеду, але на душы было радасна. Па вачах, поціскам рукі здагадваўся: разумеюць яго людзі, вераць яму. А што больш патрэбна кіраўніку? Анічога.

— Пайду сёння дамоў раней, — сказаў ён Надзеі Паўлаўне, адчыніўшы дзверы ў бухгалтэрыю. — Падсілкавацца пара ўжо.

— Ідзіце, Аляксей Фаміч, ідзіце, — зняла акуляры бухгалтар, усміхнулася. — Я і дзяўчатак сваіх зараз

адпушчу. На танцы просяцца. Вы не забылі: сёння адкрываецца новая танцпляцоўка?

— Не, не забыў. Танцор з мяне няважны, Паўлаўна. Хіба што пагляджу, як будуць танцаваць іншыя.

— Не скромнічайце, Аляксей Фаміч, — чамусьці смялей, чым звычайна, падала голас Люда і тут жа зноў уткнулася ў паперы.

Сястра не здзівілася яго ранняму вяртанню з работы.

— На танцы пойдзеш?

— Пайду.

— Ну й правільна. Калі ж пагуляць, як не ў маладосці. Пасля абсыплешся дзецьмі, не да танцаў будзе.

А гарэзлівая пляменніца Нінка абхапіла Аляксея за калені, пачала прасіць:

— Дзядзя Лёша, пагуляй са мной у жмуркі. Ці ў "коніка".

Яшчэ там, у далёкай Аўстрыі, Аляксей не раз лавіў сябе на неадольным жаданні ўзяць у рукі дзіця, пагушкаць яго. Таварышы па службе часта зайздросцілі яму, наракалі вялікую сям'ю ў "гражданцы". І ўсё таму, што сярод мноства чатырохкішэнных артылерыйскіх бушлатаў, як дзве кроплі вады падобных між сабой, дзеці чамусьці выбіралі менавіта ягоны, Аляксееў бушлат, ахвотней ішлі да яго на рукі, даверліва туліліся да салдацкай шчакі. Што ж датычыцца Нінкі, дык яна ад самага прыезду прыліпла, што смала, нідзе не адставала ад яго і ні на хвіліну. І Аляксей гуляў з пяцігадовай непаседай ва ўсе дзіцячыя гульні: у "класы" — скакаў на адной назе па самаробным пярэстым палавіку, штурхаючы наперад наском шлёпанца пачак запалак; у жмуркі — знарок доўга ніяк не мог знайсці пляменніцу, хаця сядзела яна побач у схованцы пад сталом ці дзекольвечы ў куце; у "коніка" — калі трэба было на карачках вазіць на сабе "самую смелую на свеце наезніцу".

І на гэты раз Нінка моцна трымалася за каўнер Аляксеевай сарочкі, адчайна нокала і рашуча патрабавала:

— Хутчэй, конік, хутчэй!

— Хопіць, стаміўся ўжо твой конік, — запярэчыла сястра і ўзяла Нінку на рукі. — Я даўно прыкмеціла,

Алёша, ты любіш дзяцей, і яны цябе вельмі любяць. Значыць, і жонка будзе любіць. Прыкмета ёсць такая: дзіця за руку бярэш, маці — за сэрца. Не чуў? Гэта наша мама так гаварыла.

— Хіба можна дзяцей не любіць?

— Усякае бывае. Тым больш цяпер, пасля вайны.

— Прычым тут вайна? Дзеці заўсёды дзеці. Без іх, як без рук.

Сястра, як некалі маці, ласкава прыгладзіла яго ўскудлачаную чупрыну.

— Малайчына, ты, Алёша. Жаніцца табе трэба. Упадабаў ужо каго?

— Здаецца, так , а ўвогуле, — сумеўся, пачырванеў, — давай замнём гэту гаворку.

— Давай.

Нінка першай учула за дзвярамі знаёмыя крокі, выслізнула з матчыных рук і тут жа трапіла ў абдымкі бацькі. Аляксею было да спадобы штовечар назіраць, як вяртаўся з работы швагер, Міхаіл Міхайлавіч. Працаваў ён у леспрамгасе, на валцы лесу, таму апранаўся не надта каб элегантна. Зялёны брызентавы шлашч і цяжкія гумавыя боты ён здымаў яшчэ ў сенцах. Там жа на сцяне вешаў скураную кепку-васьміклінку і шэры картовы пінжак, а сам у ваўняных шкарпэтках заходзіў у пакой. Тыя разы лепшым ласункам для дзятвы лічыўся "зайчыкаў" хлеб. Міхаіл Міхайлавіч асцярожна разгортваў газету, падаваў Нінцы "зайчыкавы" пачастункі: акрайчык хлеба, драбок цукру, кавалачак сала ці цыбуліну. Нінка была на сёмым небе, цалавала свайго татульку і радасна смяялася.

— Чулі ўжо навіны? — швагер прысеў да стала, стомлена варухнуў плячамі.

— Якія навіны? — насцярожылася сястра. — Нічога не чулі.

— Сашка Гаргун уцёк. Наш дырэктар увесь дзень яго шукаў, з ног збіўся. А ён, аказваецца, начаваў сёння ў гэтай... як яе... У Галкі... А раніцай абое ўцяклі. Бачылі іх на досвітку каля вакзала...

Сястра ляскала ў далоні, выпытвала падрабязнасці ўсёй гэтай гісторыі. Аляксей стаяў, як укопаны. Яму падалося, што ў грудзях раптоўна спынілася сэрца і ён не можа ўздыхнуць — забіла дых. Расшпіліў верхні гузік сарочкі, тузануў, каб паслабіць, вузел

гальштука, непрыкметна злаўчыўся ўздыхнуць. Цяпер сэрца затрапяталася, як птушка, трапіўшы ў сіло, ён нават пачуў роспачны грукат яшчэ дужых крылцаў. Выйшаў на двор. Закурыў. "Як жа так можна?.. Што ж гэта такое?.. Няўжо сапраўды на свеце няма такога каварства, да якога б жанчына аказалася няздатнай?" І бязмэтна паплёўся за веснічкі.

Доўга блукаў бязлюднай вулачкай — не хацелася страчацца са знаёмымі. Ён ішоў наўздагад, куды вочы глядзяць. Ачуўся толькі тады, калі ўбачыў, што перад ім завешанае акно Галінага пакойчыка. Пад акном буйна цвіла рута-мята. Чамусьці спалохаўся да таго, што аж здрыгануўся ўсім целам. Крута павярнуўся і пайшоў прэч. Шпарка, амаль подбегам, не зважаючы ўвагі на прахожых, пераважна маладых людзей, якія нетаропка кіраваліся ў бок танцпляцоўкі. Яго паклікалі:

— Аляксей Фаміч! Вы хіба на танцы не ідзяце?

Азірнуўся. Люда па-дзіцячы наіўна і абыякава пакручвала ў пальцах зялёную галінку, глядзела на яго здзіўлена і сарамліва. У белых туфельках на высокіх абцасах яна выглядала яшчэ больш стройнай. Белая сукенка прыгожа аблягала фігуру, рабіла яе прывабнай і лёгкай, як пушынка.

— Чаму вы на мяне так глядзіце? Не пазналі?

— Пазнаў. Ты сёння такая прыгожая. Сапраўды, можна не пазнаць. Хадзем разам, Люда. Напрасткі, цераз парк. Так бліжэй.

— Там жа мокра, — спынілася яна перад кюветам.

Аляксей лёгка падхапіў Люду на рукі і, абмінаючы замшэлыя ўпадзіны між сосен, кустоўе парасніку крушыны, панёс у бок танцпляцоўкі.

На звечарэлым небе ўспыхвалі па-летняму буйныя зоркі. У голлі купчастых дрэў і злева, і справа не сунімаліся аліўкава-зялёныя перасмешкі, бяздумныя пераймальніцы галасоў тутэйшых птушак, з выгляду спаважныя — акурат, як бывалыя кухаркі, і ўсе, як адна, у жоўценькіх бліскучых фартушках.

Здалёку даносіліся нетаропкія гукі падыспані.

* * *

Так, гэта была яна.

— Цяпер ты ведаеш усё... — Галіна адкінулася на спінку крэсла за прыстаўным сталом, дзе яна

сядзела, пакратала рукой "кошык" валасоў, залатую завушніцу пад вухам і працягвала: — Пра нас з Сашкам тады няпраўду гаварылі, быццам мы абое ўцяклі. Ён паехаў адзін, а я засталася ў Ядзі. Бачыла, як ты падыходзіў да майго акенца. Як потым Люда цябе запыніла. Як ты панёс яе на руках. Я доўга плакала ў той вечар і разумела сваю непапраўную памылку.

Яна яшчэ многа гаварыла аб сваім жыцці-быцці ў Мінску — "трыццаць гадоў прамільгнула, як адзін дзень", але Аляксей ужо не слухаў яе. Неадчэпная думка, якая пакрыўджанай пчалой вілася здаля, цяпер рашуча ўпілася ў галаву: "Навошта ты мне гэта ўсё расказваеш? Што прывяло цябе сюды?.." І бадай што ўпершыню, зняўшы акуляры, ён перабіў яе:

— А дзе Сашка? Што з ім?

— Спіўся. Мы развяліся яшчэ залетась.

— А дзеці?

— Дзяцей у нас не было. Спачатку самі не хацелі, а пазней, як ён стаў піць... — махнула рукой, — няма чаго пладзіць калек. — Уздыхнула па-жаночы, глыбока. — Тваіх дзяцей я ведаю. Мне паказвалі іх ў Мінску. Усё яшчэ студэнткі?

— Не. Ужо працуюць. Меншая, Аленка, пакуль што з намі, у дзесяты клас ходзіць. Дарэчы, у яе сёння дзень нараджэння. Вось падарунак ёй прызапасіў.

Аляксей выняў з шуфляды вялікую каробку цукерак "Асарці" і паклаў на край стала. Галіна горка скрывіла губы.

— Цярпець не магу шакаладу. Самыя смачныя на свеце цукеркі — "падушачкі". Шкада, што іх цяпер не выпускаюць...

І зноў гэта неадчэпная думка-пчала. Упіла сваё джала, аж млосна робіцца: "Што ж усё-такі прывяло цябе сюды? Што?"

Яна быццам адгадала яго думкі.

— Люда твая як цяпер маецца? Казалі, яна дужа хворая, у нейкім інстытуце доўга ляжала? Страшна аднаму заставацца...

— Папраўляецца Люда. Цяпер жа ведаеш як: прышчынак на губе сядзе — і ўсе жахаюцца: рак. У яе, слава богу, усё нармальна.

Галіна заспяшалася, устала.

— Аднак засядзелася я ў цябе. І разгаварылася адкрыта. Адно цяпер падумала: ты ж можаш пра гэта напісаць. Хоць прозвішча маё не называй, а то, чаго добрага, яшчэ пакараць могуць.

Аляксей узняўся з-за шырокага, заваленага газетамі і кнігамі стала, адвярнуўся да акна. Не сказаў, а выдыхнуў адным махам:

— У нас, напэўна, і закону такога няма, па якому б так бязлітасна каралі чалавека, як гэта зрабіла ты сама.

— Твая праўда, Лёша, — пачулася за спіной. — Бывай.

Ён не адказаў.

Вяртаючыся дамоў, Аляксей запаволіў хаду каля гарадскога сквера — якраз насупраць колішняга Абажанкавага дворышча. У засені галінастых таполяў гулялі дзеці. Дзе-нідзе на масіўных — з месца не зрушыш — лаўках сядзелі пажылыя людзі. Па асфальтаваных алейках прагульваліся няйначай як кандыдаты ў маладажоны. Было дзіўна: ніхто з іх не ведае пра тое, што адбылося на гэтым месцы больш за трыццаць гадоў таму назад.

— Расказаць вам пра гэта, ці што? — уголас падумаў Аляксей.

Каля некідкага дамка-пяцісценкі ў маладым яблыневым садку, як і заўсёды апошнім часам, яго чакала жонка, Людміла Сцяпанаўна. Зірнула на каробку "Асарці", пакруціла галавой:

— Песціш ты ўсё-такі Ленку. Падумаць толькі: дваццаць рублёў на цукеркі.

— Нічога, маці, цукеркамі не распесціш. Ну, а што тут у вас? Як наша імянінніца?

— У нас усё гатова. Як ты кажаш, усё ў ажуры. Мой бальнічны сёння закрылі — заўтра на працу. Стол ужо накрыты. А імянінніца — чуеш? —рыхтуецца гасцей страчаць.

З адчыненага акна даносіліся гукі піяніна і ціхая, на паўголаса, песня.

Губы твае, як макі,
Рдзеюць-цвітуць пяшчотай...

— Ленка! — паклікаў Аляксей дачку і, калі тая адхінула цюлевыя занавескі, спытаў: — Адкуль ты ведаеш гэту песню?

— Саша Кірэйка яе спявае. Знаеш, тата, настаўніца спеваў кажа, што ў яго прыродны талент. У яго такі голас — заслухаешся.

— Які гэта Кірэйка?

— Мой аднакласнік. Яго бацька стрэлачнікам быў. Ну, той самы, што п'яны пад цягнік трапіў.

— А-а, я ведаў яго, ведаў, — уздых неяк сам па сабе вырваўся з грудзей. — Колькі ж у цябе гасцей будзе, дачка?

Ленка адказала зусім па-даросламу:

— Увесь клас.

— Не пярэч ёй, калі ласка, — папрасіла Люда і ўзяла Аляксея пад руку. — Сходзім у наш садзік, пакуль госці збяруцца.

— Я згодзен. Тым больш, мне ёсць пра што падумаць і ты дапаможаш мне сёе-тое дакладна-праўдзіва ўспомніць.

У галінастых кронах антонавак і пепіну заліваліся залётныя малінаўкі. Яны, аказваецца, спяваюць і ў прадвячэрні час. З адчыненага акна зноўку неслася даўным-даўно забытая песня:

Кружаць пялёсткі роем.
Росна лугі іскрацца.
Як бы хутчэй абоім
Нам у жыцці спаткацца.

Свет абыду, як трэба,
Дол абшукаю й неба.
Толькі знайду я — веру! —
Зорку маю Венеру.

Прыпеў паўтараўся двойчы.